ВАСІЛЬ ВІТКА

# Чытанка–маляванка



ВАСІЛЬ ВІТКА

# Чытанка-маляванка





ВАСІЛЬ ВІТКА

# Чытанка-маляванка

Ладачкі-ладкі,
лічылкі, загадкі,
байкі, самагудкі,
жарты, перакруткі,
казкі, пацешкі,
вясёлыя ўсмешкі.



Мінск «Юнацтва» 1998

УДК 882.6-93
ББК84 (4Беи)6
В54

Мастак А. Александровіч

*Для дзяцей дашкольнага*
*і малодшага школьнага ўзросту*

© В.Вітка, 1998
© Ілюстрацыі. А. Александровіч, 1998

ISBN 5-7880-0525-6



## КАЗКІ ДЗЕДА ВАСІЛЯ

**Жыў на свеце дзед Васіль,**
**За плячыма мех насіў.**

**Дазналіся мышкі,**
**Што ў мяшэчку кніжкі,**

**Разгрызлі завязкі,**
**Бачаць, ажно ж — казкі.**

**Сталі клікаць дзяцей:**
**— Гэй, сюды усе хутчэй!**

Ёсць тут маляванкі,
Складанкі-чытанкі,

Байкі-самаграйкі,
Песні-калыханкі,

Жарты-перакруткі,
Гуслі-самагудкі,

Лічылкі-загадкі,
Ладачкі-ладкі...

Прыходзьце, малышы,
Кожнаму пацешка ёсць!

Дзед Васіль, а ты пішы
І яшчэ нам прынось.

# Ладачкі-ладкі





## АЙ І ОЙ

Ладачкі-ладкі...
А дзе мае тапкі?
Ладачка, пашукай.
— Ай!

Ах ты, непаслушка,
Давай сюды вушка.
Не хачу гуляць з табой.
— Ой, ой, ой!



## БАБІНЫ ГОСЦІ

Ладачкі-ладкі,
Дзе былі? — У бабкі.

Што пілі вы? — Малако.
А што елі? — Ко-ко-ко.

Доўга ж вы сядзелі,
Доўга пілі, елі.

— А мы не сядзелі —
Цэлы дзень дурэлі.

Мы і заўтра пойдзем
Да бабулі нашай —

Абяцала бабка
Бярозавай кашы.

**ДАРОЖКА**

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.

Дарожка крывая,
Кабылка сляпая.

Еду, еду, еду,
Не натраплю следу.

Пасаджу дзіцятка
Я на казлянятка.

Казлянятка ўпала,
Ножку паламала.

Сын прачнуўся рана,
Сеў ён на барана.

Баранок падбіўся,
А сынок зваліўся.

Барана пакіну,
Завяду машыну.

Ту-ту-ту, машына,
Вязі майго сына.

## МАМА МЫЛА РАМУ

Мама мыла раму,
Мама дочку мыла.
Дочка стала мамай,
Пра раму забыла.

Ёсць у мамы дочка,
Ёсць у бабкі ўнучка,
Дзесяці гадочкаў
Ўнучка-беларучка.

З мамай вучыць гаму
Ўнучка-белалапка.
А хто ж мые раму?
Раму мые бабка.

## ЗА ДЗВЕ МІСЫ

— Вер, Мішэль,
Вермішэль
Неабходны для здароўя...

— Мама, мамачка, здароў я.
З'ем дзве місы вермішэлю,
Толькі не заві Мішэлем.

З'еў дзве місы —
І нялысы.
Не бяда, што ледзьве дыша,
Ды затое стаў ён — Міша.

## КОЦЯ І КАЦЯ

Плача коця на кухні,
Ад слёз вочкі папухлі.

— Што з табою, мой каток,
Забалеў мо жываток?

— М-мяў,— сказаў варкоцік,—
Не баліць жывоцік.

У мяне душа баліць —
Як цяпер на свеце жыць,

Як мне жыць у хаце,
Калі хлусіць Каця?

Смятану злізала —
На мяне сказала.

## МЛЫН

Чыкі, чыкі, чыканачкі,
Едзе зайчык на саначках.

Пасярэдзіне сяла
Зачапіўся за тын.

Пытаецца ў Васіля:
— Скажы, браце, дзе тут млын?

— А навошта табе млын?

— Захацеў аладак сын.
Ды і сам я, стары,
Згаладаўся ў бары
І кары ўжо не ўгрызу —
На муку малоць вязу.

— Калі ласка, касавокі,
Млын адгэтуль недалёка:
Бачыш, вунь за сялом
Дзед махае памялом?

## САРОЧЫНЫ БЛІНЦЫ

Клапатлівая сарока,
Гаспадыня белабока,
Па прыпечку скакала,
Бліны рашчыняла.

А дачушка памагала.
Сынок цеста мясіў.
Другі сын ваду насіў.
Трэці ў печы паліў.

А чацвёрты сядзеў,
На агеньчык глядзеў,
Памагаць не хацеў.
Бліны маці даставала,
Усіх дзетак частавала:

— На, дачушка, блінец,
Ты ў мяне — маладзец.
І сынок — маладзец,
І яму даю блінец,

І табе, сынок другі,
Мой памочнік дарагі.

Самы смачны блінок
Возьме трэці мой сынок...
Дзеці ўсе бліны паелі.
Шух, шух — паляцелі.

— Ну, а дзе ж, а дзе мой блін? —
Запытаў чацвёрты сын.—
Мама, дзе мой блінец?
— А табе няма.
Канец.



## КАЛЫХАНКА

Люлі, люлі, люлі,
Дзеткі ўсе паснулі.

Не спіць толькі коця,
Ходзіць па балоце.

Застудзіў ён лапку,
Прыйшоў грэцца ў хатку.

Недзе коцю дзецца,
Лапачцы пагрэцца.

Палез на палаткі,
Спалохаўся бабкі.

Палез ён на вышкі,
Там гулялі мышкі.

Так яны дурэлі —
Хвост кату ад'елі.

Пайшоў каток у лясок,
Знайшоў белы паясок,

А котачка узяла
І дзіцяці аддала.

Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток.

Ці самому з'есці,
Ці дадому несці?

Думаў, думаў каток,
Укусіў адзін разок

І панёс дадому
Дзіцятку малому.



## ІВАНКА

Баю, бай, Іванка,
Прыйшла калыханка.
Павярніся на бачок
І засні, мой хлапчучок.

— Мама, мне ўжо два гады —
Пайду ў лес па ягады,
Буду рваць ігрушы
На калакалушы,
На ляшчыне — шчаўе,
На шыпшыне — траўе,
На алешыне — чарэшні,
На крушыне — песні,
На явары — звон, звон,
На ясені — сон, сон...

А дзе ж калыханка?
— Я з табой, Іванка.

# Пацешкі



## МАСТАК

Прынясіце ліст паперы,
Што шырэй за нашы дзверы,
Што вышэй за нашу шафу,–
Намалюю вам жы-ра-фу.

## БАРАБАНКА

На двары
Стары
Баран
Грукаў зранку ў барабан,

Пакуль Ганка
Не прагнала
І нагой не топнула.

— Перастань! — сказала.—
Барабанка
Лопнула.

Здзівіўся баранка:
— Якая барабанка?

— Перапонная! —
Сказала Ганка сонная
І адразу спахапілася:
— Я, здаецца, памылілася.

Разбудзіў мяне ты зранку,
Грукаеш бесперастанку,
І я зблытала спрасонку
Барабанку з перапонкай.



## ПАЖАР

Барсук —
Балабон
Б'е ў сук,
Як у звон:

— Ой, бом, бом,
Ой, мой дом!..

Прыбег лось з зубром
І алень з багром,
Бабрыха з бабром
І выдра з вядром,
Расамаха сама...
— Дзе пажар?
— Няма.

Над зямлянкай барсучынай
Спела буйная шыпшына.
І сказалі сябры:
— Меней спаў бы ты, стары.

## БАБРЫ

Дабёр бабёр,
Бабраняты — на падбор.
Малайцы бабры,
Нашых рэк гаспадары,
Вартавыя крыніц,
І куніц,
І суніц,
І лясоў,

І ласёў,
І птушыных галасоў.

Хто заб'е бабра —
Не пабачыць дабра.

**ПІЛА**

Наша вострая піла —
Не піла,
А пчала.

Не піла,
Не ела,
Ні разу не прысела.

А ўсё пела
І гула —
Вясёлая піла.

Папілавала дровы —
Будзьце здаровы!

**ТАЧЫЛЬШЧЫК**

Тачу, тачу, абточваю,
Начыста заточваю,
Канцы з канцамі сточваю.

Калі што недаточана,
А можа, ператочана,
За точку пераплочана,—

Хутчэй,
Хутчэй даточвайце
І не пераплочвайце!

## ПАДАБЕД

Выпраўляў унукаў дзед
З поля на падабед:
— Ты, Сава,
еш
сала,
Ты, Язэп,
рэж
хлеб...

Прыйшлі браты,
Разявілі раты,
Сядзяць, не ядзяць —
З чаго пачаць?

Чакаюць браты,
Пакуль прыйдзеш ты.

## ГАСЦІНЦЫ

У хусцінцы —
Тры гасцінцы:

Табе, братка,—
Шакаладка,

Табе, дружок,—
Піражок,

А сястрыцы —
Тваражок.

Табе, свінка,—
Хусцінка:

Умыйся,
Утрыся
І спаць
Лажыся.

## АД САМАГА РАНКУ

Ад самага ранку
Нічога не еў.
Хлеба ўзяў буханку,
Намачыць хацеў.

Як на тое дабро —
Не ўлезла ў вядро,
Дык я ўсухамя —
Ледзь дажыў паўдня.



## ЦЯЛЯТКАМ

Вам, цяляткам, мала кавы,
Вельмі мала чаю —
Выпіце лепш малака вы,
З'ешце малачаю.

А траву пакашу —
Дам вам сена па кашу.

## ОТ Я ДАЎ

— От я даў яму.
— Каму?
— Забіяку таму.
Ледзьве ўцёк ён ад мяне.
— Дык давай
Уставай
І хутчэй сам уцякай.
— Не.
Яшчэ трохі паляжу
І ў той бок пагляджу.
Хай вярнуцца ён пасмее —
Уцячы паспею.






## БЫЧОК

— Бысю, бысю, бысенька,
Беленькая лысінка,
Хто гэта набіў табе
Аж дзве шышкі на ілбе?

— Гэта ж я з Пятром бароўся,
Пабароў Пятро мяне.
З таго часу я зарокся,
Што ўжо больш не буду — не,

Бо калі яшчэ хоць трошкі
Болей саступлю яму,—
Ой, баюся я, што рожкі
Вырастуць і ў Пеці... М-му!



## ЗАБІЯКІ

Знайшлі пеўні зломак-грэбень.
А нашто ён ім патрэбен?
Як схапіліся сварыцца,
Потым біцца, калаціцца.



Вырваў лысаму руды
Палавіну барады.

Ледзьве я разбараніла,
Памірыцца ўгаварыла.

Рады пеўні разысціся,
Ды не могуць адсапціся.



Раптам чую голас лысага:
— Ты адкуль, дачка?
— З Барысава.
— А чыя ты?
— Дзянісава.
— Як завуць цябе?

— Ганусся.
— А што робіш?
— З вас смяюся.

## ДОЖДЖЫК З СОНЦАМ

Дождждык
З сонцам папалам
Па лісці
Залапатаў.
Я ісці
Сабраўся ў цырк,
А ён з хмаркі —
Цырк, цырк, цырк.

Пад ліпкаю пачакаю,
Не пайду па дажджу.



## ПЕСТА

Злая, злая песта
Замясіла цеста.
Спякла перапечку,
Залезла на печку
І ў куточку:
Гам, гам, гам.
— Дай каточку!
— Н-не, не дам.

## ПРАСТАКВАША

Наша бабка збан адкрыла.
Наліла нам крыва-крыва...
І дала мне і Наташы
Па талерцы крывакашы.
Не, не крыва —
Дала проста.

І не кашы —
Дала квашы.
Дала проста
Прастаквашы.

## ЧУТКА

Пра мяне пусцілі чутку,
Што пакрыўдзіў я Анютку,
Я ж нікога —
Нікагутка,
Анічога —
Нічагутка.



## БЛЁКАТ

Нарабілі клопату —
Аб'еліся блёкату
І ляжаць упокат —
Вось што робіць блёкат!

## БЛАГАТА

Добраму чалавечку
Добра і ў запечку,
А благой благаце
Не ўнаровіш на куце.

## ПАН

Чатыры чатыркі,
Дзве растапыркі,
Шуба нападрост,
Кароценькі хвост.
Што гэта за пан?
Пэўна, сам баран.

## МУЗЫ́КІ

Тылі, тылі, скрыпачка,—
Грае дзед на прыпечку,
Баба б'е ў скавараду:
— Ой, загуду, загуду.
Састрыжы, дзед, бараду —
Танцаваць з табой пайду!



## ТУК



Па патэльні: тук, тук.
Гэта мы мачаем тук.

— Ты, Марынка, выбачай,
Асцярожней мачай.
Не кідай бульбы з рук,
А то пырскаецца тук.

Бачыш, на сукенцы — жук,
Тлусты жук, і не адзін.
І на маёй кашулі жук,
Які страшны — паглядзі!



— Сам ты, брацік,
Добры жук,—
Гэта тук, тук, тук!
Не хлусі ты мне, а лепш
Лусту хлеба адрэж.



— Выбачай,
Марынка.
На, мачай
Скарынкай.

## АБЫЯК

Абыяку — абы-як,
Або гэтак, або так.
Абыяку — абы,
Абы збыць абы-куды
Абы-што, абы-чыё,
Абы толькі не сваё.

Абыяк — абібок.
Вось і ўвесь яго
Урок.



## ПАЖАДАННЕ

Малеча, малеча,
Добры чалавеча,
Прычапі хвост авечы,
Закінь ногі на плечы,
Вазьмі вушы ў жменю,
А нос у кішэню,
Паеш кашу шылам,
Памый язык мылам,
Палаві ўсіх камароў —
Будзь здароў.
На вясёлы жарт
Крыўдзіцца не варт.



## ТЫДЗЕНЬ

Па нядзелі Панядзелак
Пачынае свой надзелак
І няўрымслівы Аўторак
У рабоце не заморак.

Наперадзе чарада,
Пасярэдку Серада,
Даў ёй слова напавер:
Выручыць сястру Чацвер.

Вясёлая Пятніца —
Заўсёды выдатніца,
А прайшла Субота —
Скончана работа.

Красуня Нядзеля
Абновы надзела.

## МЕСЯЦЫ

Кожны месяц — чараўнік:
Студзень, люты, сакавік,
Красавік, і май, і чэрвень.

Едзе наш дзетсад у Чэрвень:
Ліпень, жнівень, верасень —
Ўсе лясы у верасе.

А кастрычнік, лістапад —
Хто з нас восені не рад!

Зацярусіць снегам снежань,
І не ўлежыць нават лежань:
Ўсе на санкі, на канькі —
Незабыўныя дзянькі!
Лепшае пары няма,
Дзякуй, зімачка-зіма!

## У АБУТКОВЫМ МАГАЗІНЕ

— Калі ласка, сандалеты,
Сандалеты нам на лета.

— Сандалетаў няма.
Не сезон, цяпер — зіма.

— А ці ёсць у магазіне
Сезонныя сандазімы?

— Кагадзе што паступілі,
Іх адразу ж раскупілі.

— Ну, тады мы вас папросім
Сандавосені на восень

І хоць парачку адну
Сандавёснаў на вясну!

## ПАЛЬЦЫ

— Ты, таўстун Вялікі,
Маўчун без'языкі,
Зверху ўніз ківаешся,
Сам сабе ўсміхаешся.

А вось Указальны —
Хлопец паказальны:
Толькі ў бок павярну —
І ўжо грозіцца: — Ну-ну!

Ты, Сярэдні, пасярэдзінцы,
У гульні на вышыні,
Да тваёй пайду радні —
Безыменнага і Мезенца.

Безыменны, Безыменны,
Мой памочнік незаменны,
У цябе спытаю я:
Дзе ты дзеў сваё імя?

— Ат,— прамовіў Безыменчык,—
Што табе мне адказаць?
Я не плачу і не енчу,
Што імя забылі даць.

— А ты, хлопчык Мезены,
Ты адкуль прывезены:
З Мезені, з Бярозава,
З Мазыра ці з Грозава?

Узлаваўся Мезенец:
— Я не госць, не бежанец.
Родны сын я сваёй маці,
Самы спрытны на падхваце.
Мы — браты ў адной сямейцы,
Ўсе — выдатныя умельцы.

## ПАРТРЭТ

Намалюю вам партрэт.
Што спярша? Спярша — берэт.
Пад берэтам — галава:
Круг адзін, абапал два.
Гэта будуць мае вушы.
Што яшчэ дадаць я мушу?
Нос — кружок, і рот — кружок.
Ты пазнаў мяне, дружок?

Друг пазнаць мяне не хоча,
Галавою круціць друг.
Ах, забыўся я пра вочы!
Калі ласка, яшчэ круг,
І яшчэ крутну разок —
Самы меншы мой кружок.
Вось цяпер партрэт удаўся.
— Праўда? — ў мамы я спытаўся.

Мама глянула здалёку:
— Надта ж розныя кружочкі —
Адно вунь якое вока
І зусім малое вочка.
— Ах, някемная якая.
Падыдзі, убачыш зблізу:
Гэтым кнігу я чытаю,
Тым — гляджу я тэлевізар.

Рада мама: — Сынку родны,
Як ты здорава падобны!

# Скорагаворкі





## РАК

Рак поўз паўз барак,
Сустракае рака грак:
— Здароў, рак, дай руку,
У раку завалаку.

## КРОТ

Хадзіў певень па надворку
І знайшоў скорагаворку:

Падрыў крот
Крывы плот,
Рые норку
Ў агарод.

Трэ пастрашыць недарэку:
— Ку-ка-рэ-ку! Ку-ка-рэ-ку!

Затаіўся ў норцы крот —
Як зямлі набраў у рот.

## ШПАЧОК

Пайшоў шпак на шпацыроўку,
Знайшоў хустку-кашміроўку.
А шпачыха завязала
І нічога не сказала.

Пайшоў шпак на шашу,
Знайшоў шапку малышу.
— Харошая шапка.
Дзякуй табе, татка.



## ПАСЯРОД ДВАРА

Пасярод двара — гара,
На вяршэчку — сані.

А хто што дастане —
Гаварыце самі.

Сонечка — саначкі,
Верачка — вяровачку,
А малы Іваначка —
Скорагаворачку.

## СКАЧА ГРАК

Так і сяк,
Наўскасяк
Скача грак
Кракавяк.

Скача так
З грачыхаю,
Што шпак
Ад пылу чыхае.



## КОБРА

Улавілі
Кобру,
Пасадзілі
Ў торбу.

Калі ў торбе
Кобра —
Гэта вельмі
Добра.

## ДОБРЫ ГОСЦЬ

Добры госць
Есць, што ёсць.

У благога свая чэсць:
Што ёсць — не есць.

## ЦІ ЛІЛІ

— Ці лілі алей у рэдзьку,
Ці лілі?
— Ты не цілілікай, Федзька,—
Сам налі.





## ЛЕЖАНЬ, СЕДЗЕНЬ

Лежань лежма ляжыць,
Седзень седзьма сядзіць,
Бягун бегам бяжыць,
Крыкун крычма крычыць,
Гультай гульма гуляе,
Абібок бок абівае,
Баба дому даглядае,
Дзед унукаў забаўляе.

## ВОЎК

Хвошча, хвошча дождж,
Воўк схаваўся ў хвошч.
Хвост пад хвашчом,
А сам пад дажджом.

## СОРАК САРОК

Прыручыць сароку —
Адна марока,
А сорак сарок —
Сорак марок.



## ТАРАРАМ

Драч-рвач,
Зубны ўрач,
Што за крык,
Што за плач,
Што за гам —
Тарарам?

— Зубы рву
Камарам,
Каб не грызлі камары
Доктаравай дзетвары.

## ДУДАР ДУДАРУ

Дудар
Дудару
Дарма грае.

Камар
Камару
Голас пазычае.

Варона
З вароны
Грошыкі бярэ.

Коршак
З коршака
Пер'е дзярэ.



## КАПЯЛЮШ

Лепш не кратай, лепш не руш
Мой дзіравы капялюш.
Падабаецца — надзень,
Але толькі на дзень.
Раз надзень, два надзень,
Куды хочаш, туды дзень.

## КАПЫЛЬСКАЯ ГОРКА

Хочаш знаць скорагаворку
Пра адну крутую горку?
Не ўзабрацца на гару
І самому камару

З незагнутым наском,
З непадкутым палазком.
Не спусціцца і з гары —
Што ты там ні гавары.



Носа, брат, не капылі,
Сані стаў на капылы
І кацiся на вазку,
Роўна, як па валаску.

І малы, і стары
Ў Капылі на капылах
Стрымгалоў ляцяць з гары,
Нават глянуць проста страх.

Толькі мільгаціць зямля.
— Права, лева руля! —
Гэта нам крычаць здаля
Капыляне з Капыля.

# Лічылкі







## РАЗ, ДВА, ТРЫ, ЧАТЫРЫ...

Раз, два, тры, чатыры —
Зайчык вушкі натапырыў.

Ідзе з лесу воўк, воўк
І зубамі: шчоўк, шчоўк.

Мы схаваемся ў кусты:
Зайка, я, і ты, і ты.

Ты ж, ваўчына, пачакай,
Як схаваемся — шукай.

## БУЛАВА

Раз, два — булава,
Тры, чатыры — падчапілі,
Пяць, шэсць — табе чэсць,
Сем, восем — цябе просім:
Дзевяць, дзесяць — дай павесіць,

Дай павесіць булаву
На тваю галаву.
А ты стой і маўчы,
Сам спачатку лічы.

Дзесяць раз лічы па дзесяць,
Не палічыш — стой хоць месяц.

## МАЛЫЯ АЛЕНІКІ



Малыя аленікі
Елі варэнікі,

Журавель — журавіны,
А жырафа — апельсіны,

Бегемот — ананасы,
А янот — бульбу з квасам.

Жук жур жор,
Тхор сыр цёр,

Грызла рысь рыс,
Барбос — барбарыс.

Вам наце
Па аладцы.
Табе, браце,—
Закрывацца.

## ПАЛАЧКА-СТУКАЛАЧКА

Хто за кім?
Я каторы?

За мной — Клім,
За ім — Лора.

Ты будзеш трэці,
За табой Пеця,

За Пецем Клава,
За Клавай Слава.

Малога Саўку
Пасадзім на лаўку.





Вось табе, Савачка,
Палачка-стукалачка.

Ты сядзі, адпачывай,
Блізка нас не падпускай.

Вартуй сваю палачку,
Палачку-стукалачку.

## ПОПЕЛ, ПОПЕЛ...

Попел, попел, папяльніца,
Ты — мой брацік, ты — сястрыца,
Ты — дружочак, ты — падружка.
Ты — козачка, а ты — птушка.
Табе крыльцам накрывацца,
Нам усім — хутчэй хавацца.



## ВАЛАКУЧА

Кузьма падкузьміў Ягора,
Ягор аб'ягорыў Рыгора,
Дзямід паддзямідзіў Мікіту,
Мікіта змікіціў,
Пачаў валакіту.

Сказаў Фабіяну:
— Фабіян, пабі Яна.

Ян пабег па Хомку,
Хомка — па Пахомку.

Пахомка па Піліпа,
Піліп па Архіпа.



Крычаў Архіп,
Пакуль ахрып,

Пакуль сяло
Гарой лягло.

От была буча,
Куча-валакуча.

## НУЛЬ



— Адкуль ідзяце?
— А вунь адтуль.
— Што ў мяшку несяце?
— Нуль.
Тут рашылі палажыць,
А табе — старажыць.

## НУЛЬ БУЛЬ-БУЛЬ

Ішло трое бабуль,
Бачаць, на дарозе — нуль.

Сталі бабкі ўперабой
Разважаць паміж сабой:

— Што рабіць і як тут быць,
Як знаходку падзяліць?

Было б толькі двое нас —
Разабраліся б ураз,

Падзялілі б адмыслова:
Кожнай — роўная палова

Па памеру, па вазе —
Кожнай бабе па дузе.

Кожнай — роўна паўкруга:
Мне — дуга, табе — дуга.

Жаль, што так у нас не выйдзе —
Вельмі ж трэцюю пакрыўдзім...

Трэцяя сказала: — Не,
Будзе вам і будзе мне.

Дзякуй, дзякуй вам, бабусі,
Ў крыўдзе я не застануся.

Мілыя мае падругі,
Забірайце свае дугі.

З вашага дазволу я
Вазьму дзірку ад нуля.

Дзякуй вам, што памаглі
Мне застацца пры нулі,

Бо навокала
Нуля
Круціцца
Уся зямля.

На ўвесь свет
Праславіў Нуль
Сваё прозвішча:
Буль-Буль.

Добра дзецям быў знаём
Круглым тварам,
Круглым лбом.
Малачко любіў, булён,
Возьме бутлю — і нагбом:

Буль, буль, буль,
Буль, буль, буль.
Гляне,
А на дне ўжо —
Нуль.



Нуль Буль-Бульчык круглатвары,
Не любіў ён акуляры,
Бо замест вачэй былі
Ў Буля круглыя нулі.
І заместа носа — нуль,
А пад носам: буль, буль, буль.

І заместа рота — нуль,
Вось адгэтуль і дасюль,
А то, можа, і шырэй,
І вышэй нулёў — вушэй.



Матчын сын, унук бабульчын,
Быў ён самы лепшы вучань.
Не гарэзнік-беспрытульнік,
Нуль Буль-Буль быў круглы нульнік.
Тры гады быў у адным
Ён у класе нулявым.

Больш за ўсё любіў Нуль Буль
З мыла бурбалкі: буль, буль.
Як пачне ў саломку дзьмуць —
Пухіры плывуць, плывуць
І па небе, па зямлі —
Каляровыя нулі.



А аднойчы выдзьмуў шар,
Што падняўся вышай хмар.
І тады надумаў Буля:
Выдзьму я зямную кулю.
Хай яшчэ адна зямля
Круціцца вакол нуля.

Але мыла
Не хапіла.
Мыла
Буля
Пагубіла.



Так Буль-Бульчык надзімаўся,
Так стараўся,
Напінаўся —
Лопнуў
Небарака
Нуль.

Не знайшоў ніхто дасюль
Нават следу анідзе —
Быццам пугай па вадзе,
Быццам бурбалка:
Буль,
Буль...

Ішло трое бабуль,
Бачаць, на дарозе — нуль.

Сталі бабкі талакой,
Разліваюцца ракой,
Слёзы коцяцца ў бабуль:
Мілы,
Слаўны
Нуль
Буль-
Буль.

# Гульні





## ПРАВОДЗІНЫ СНЕЖНАЙ БАБЫ

Чаму ля дзетсада
Маршы і песні?
Снежная баба
Едзе на пенсію.

Едзе з двара,
Бо прыйшла пара.
— Салют! Ура! —
Крычыць дзетвара.

Губны гармонік
Склікае збор.
Выходзіць дворнік,
За ім — шафёр.

Пад ручанькі белыя
Бабку ўзялі
І саслабелую
Павялі.

Бабка садзіцца
На самазвал,
Баіцца

Спазніцца
Яна на вакзал.

— Хвілінку! — з усмешкай
Сказаў кладаўшчык.—
Да гэткай спешкі
Я не прывык.

Глянуў сурова
Бабулі ў твар:
— Прашу, паважаная,
Здаць інвентар.

Здайце, бабуля,
Па акту ў кладоўку
Кій і каструлю,
Мятлу і маркоўку.

Здайце, бабуля,
Казённыя рэчы.
Праз год вам сустрэчу
Я зноў забяспечу...

Доўга ішоў бы
Ўрачысты парад,
Доўга цягнуўся б
Службовы агляд,

Каб не спасцігла
Бабу бяда:
Зака́пала ў бабы
З носа вада.

Са звонам упалі
Са стрэх ледзяшы.
І загукалі
Услед малышы:

— Спяшайся,
Бабуля!..

Вяртайся
Зімой
Снежнаю,
Свежаю
І маладой!



## КЛАСЫ

Паглядзіце вы на нас,
Як мы лёгка з класа ў клас

Скачам па дарожцы
Ўсе на адной ножцы.

Падскочылі дзесяць раз —
Скончылі дзесяты клас!



## ЛЕЎ

Здароў, Лёва,
Давай лапку.
Ты гатовы
Ісці з бабкай?

Малы Лёва
Хмурыць бровы,
Малы Лёва
Вострыць вочы,
Малы Лёва
Зубы точыць,
Раскрывае
Лёва рот —
Р-ра-туй-ся, народ!

Раве Лёва:
— Я здар-р-овы,
Толькі я цяпер не Лёва,
Я галодны, страшны леў —
З самай раніцы не еў.

## ІРЫС І БАРБАРЫС

Ірына і Барбара
Ну, кропля ў кроплю — пара.

У Барбары, Іркі —
Косы-растапыркі.

Сукенкі па каленцы,
На кожнай — па кішэньцы.

Такая гэта пара:
Дзе Іра, там Барбара.

А дзе Барбара, Іра?
Прызнаюся вам шчыра,

Тады я толькі ведаю,
Калі з імі абедаю.

Усе падружкі і дружкі
Свае ў нас маюць хвартушкі,

І на кожным метка —
Вышытая кветка:

У Ірыначкі — ірыс,
У Барбары — барбарыс.





**КАЖУХ**

Мы з табой ішлі?
— Ішлі.
Кажух знайшлі?
— Знайшлі.

Пэўна, што згубіў мядзведзь.
Дай мне першаму надзець.
Ў кажуху раскошным нашым
І мароз не будзе страшан.
Я пра гэты кажух
Усім хлопцам раскажу...



— Які кажух?
Што знайшлі з табой удвух.
— Дзе? Калі?

А мы з табой ішлі?
— Ішлі.
А кажух знайшлі?

— Э... н-не!..
Дык навошта хлусіш мне?

## КУДЫ ЕДЗЕШ, ХЛАПЧЫНА?

— Куды едзеш, хлапчына?
— Да рынку.
— Што вязеш за плячыма?
— Свінку.

— То дай падзівіцца,
Можа б, я купіла.
Ой, гэта ж сястрыца!
Чым яна няміла?

— Міла-то міла,
Ды баіцца мыла.
Як убачыць мыльца,
Дык хавае рыльца.

Купляйце дзяўчынку,
Мурзатую свінку,
Аддам неслухмянку
За тры абаранкі.

— А ты болей гавары,
Прасі вязку поўну.

— А нашто? Нам хопіць тры:
Мне, табе, маёй сястры —
Будзе ўсім пароўну.

— Аддасі за паўрубля —
Забяру дзяўчынку я.

— Не, такой харошай
Не аддам за грошы.
Буду песні ёй спяваць,
Салавейкам шчоўкаць,
Буду сам яе купаць
Я ў цёплых начоўках.
Буду церці губкай
Носік ёй і губкі.

— Адкуль едзеш, хлапчына?
— З рынку, з рынку.
— Што вязеш за плячыма?
— Дзяўчынку, дзяўчынку.
Тпру, мой конік, тпру-тпру-тпру,
Я прывёз сабе сястру.



## КАЗЁЛ

Чулі, дзеці, навіну?
Пайшоў казёл на вайну.

Слухай, барадаты,
Вяртайся дахаты.

— Не хачу дахаты,
Я пайду ў салдаты.
На вайну
Пайду,
Разганю
Бяду.

А далёка да вайны?
— Трое сутак і два дні
І яшчэ паўдня...

Хто ваюе?
— Радня.

Ой,
Як доўга мне ісці,
Барадой
Трасці.

Дабрысці б давідна,
А то скончыцца вайна,
Спыніцца да вечара...
— Дык скажы хоць толкам ты —
Хто з кім б'ецца?
— Браты.
— Твае родныя?
— Стрыечныя.
— То чые ж яны?
— Авечыя.

Ой, казлішча, ой, хітрэц,
Дык бяжы на паплавец!

Гэта ж нашы бараны,
Век таўкуцца яны.

Разгані,
Разбарані,
Бо заб'юцца
Бараны.





## КОЗАЧКА

Козачка белая
Па гародзе бегала,
Аб'елася лебяды,
Нарабіла бяды:

Паваліла бабулю,
Патаптала цыбулю,
Пашматала часнок,—
Брык-скок, брык-скок.



Ушчамілася ў плот:
— Ой, баліць, баліць жывот.
Бабка, бабка, памажы,—
Толькі дзеду не кажы.

## СА́ВА І САВА́

Прыйшоў Сава ў лес,
На яліну ўзлез,
Падняў галаву,
Убачыў саву.

— Ты скажы, сава,—
Пытаецца Сава,—
А твая дзятва
Ведае забавы?

Выпусці іх на палянку,
Да мяне на пагулянку.
Я кожнаму савянятку
Прынёс Савіну загадку:

Чые ноччу ў гушчары
Зіхацяць два ліхтары,

Хто ўсю ноч рагоча,
Спачываць не хоча,

Хто, пабачыўшы святло,
Хутчэй лезе у дупло,—

Хто адкажа мне? Раз, два...
— Наша мама — сава! —

Сонныя гукнулі совы
І палезлі зноў у сховы.

## ВАСІЛЁЎ КІСЕЛЬ

— Мой клён! — сказаў Лёня.
— Мой слон! — сказала Соня.
Сварка ледзь не пачалася.
Добра, што сустрэўся Вася:

— Соня, твой не слон, а сон.
Лёня, твой не клён, а лён.
Сонін сон,
Лёнеў лён,
Поліна поле,
Галіна голле,
Ліліна лілея,
Надзіна надзея,
Васілёў кісель —
Дзе частуюць, там і сеў.



## ЛІСА І ЛІСІЧКІ

— Лісічкі, лісічкі,
Вы — мае сястрычкі?
А можа — дочкі?

Дык дзе вашы хітрыя вочкі?
Скажыце, прашу вас, галубкі,
Дзе хвост ваш, дзе вострыя зубкі?

Сказалі малыя лісічкі:
— Мы між сабою — сястрычкі,
Мы сваёй мамачкі — дочкі,
Самыя дружныя ў лесе грыбочкі.

## КАРУСЕЛЬ

Дапівайце кісель —
Мы ідзём на карусель.

Я пішу ў каманду нашу
Ўсіх, хто з'еў і суп, і кашу!

— А хто — кашу і крупеню?
— Першы сядзе на аленя.

— А хто — толькі адно блюда?
— Запісваю на вярблюда.

— А хто — кашу і кампот?
— Абяцаю самалёт.

— А хто — кашу і катлету?
— Калі ласка, у ракету.

Хто гатоў на карусель?
— Я! І я! І мы! — Усе!



## ЗНАХОДКА

Ішлі Тодар з Тадораю,
Знайшлі лапаць з абораю.

Кажа Тодар да Тадоры:
— Табе лапаць, мне — абора.

Стала жонка плакаць:
— Навошта мне лапаць?



Выбар мой і так вялік:
Аж тры пары чаравік,

Ёсць у мяне лодачкі
З моднае калодачкі.

Спытаў Тодар у Тадоры:
— А навошта мне аборы?

Ўзяў ён лапаць за шнурок
І закінуў у равок.

А за імі следам
Ішоў хлопчык з дзедам:

— Ты такою сеткай
Лавіў рыбу, дзедка?

— Лавіў, хлопчык мой, лавіў,
Пакуль гора не ўтапіў.

## МЫШКА

Мышка, мышка, дзе была?
— Вунь на тым канцы сяла.

Што ты там рабіла?
— Катоў лавіла,
Усіх загнала ў пасткі...

А што зарабіла?
— Лычка каўбаскі,
Хлеба акрайчык
З мезены пальчык.

Дзе ж тое лычка?
— Схапіла сінічка.

Дзе ж той акрайчык?
— З'еў малы зайчык.

З'елі хлеб, каўбаску,
Вам прыслалі казку.

# Казкі





## ДУДАРЫК

Сеў у полі на каменьчыку,
Узяў дудку на раменьчыку.

Ду, ду, ду — дуда гудзе,
Полем водгалас ідзе.

Надакучыла іграць,
Каля дуба лёг паспаць.

Вісіць дудка на суку,
Спіць дударык на баку.

Павярнуўся дагары
І так моцна ён захроп —

Скалануўся дуб стары,
Дудка — бух у самы лоб.

Тут яму і сон не ў сон,
На ілбе гудзе ўжо гуз.

Не сабраў і трэсак ён,
Бо ад дудкі — толькі друз.

Падняў хлопец паясок,
Пайшоў з плачам у лясок:

— Куды дзецца мне цяпер?
Цікаваць пайду цяцер.

Спадцішка пад куст падпоўз
І цяцёрку — хоп за хвост.

З пёрка выразаў дуду:
— Ой, зайграю, загуду.

Што было, тое сплыло,
Пайду з дудкаю ў сяло.

Я пад першы парог,
А мне з хаты — пірог.

Я на дудцы ту-гу-гу —
Ўсе нясуць па пірагу:

Мне і матка — пірог,
Мне і татка — пірог,

Мне і дзядзька — пірог,
Мне і цётка — пірог,

Мне і дзедка — пірог,
І суседка — пірог,

І брацейнік — пірог,
І пляменнік — пірог.

Назбіраў я пірагоў
Сорак восем карабоў.

Каб яшчэ адзін пірог,
Я зусім бы абнямог.

Перастань, дуда, дудзець!
Дзе мне пірагі падзець?

Сабралася ўся радня,
Памагчы ўсе рады мне.

Запрагаюць каня —
Ён і воза не скране.

Падагналі грузавік,
Для яго — груз вялік.

Папрасілі самазвала —
Ў самазвала сілы мала.

Залучыў я камара,
Магутнага званара.

Той адразу ўзяў мой воз,
Пірагі мае павёз.

Ай, камар-маладзец!
Тут і казцы канец.



## ГЕНЕРАЛ ВЕРАБЕЙ

Гэй, дарогу, гэй, шырэй,
Лес густы, высокі,—
На машыне верабей
Едзе да сарокі.

У пагонах, у шнурах,
У шпорах са звонам.
Белабока толькі: — Ах!—
Сказала з паклонам.

— Калі ласка, ваша чэсць,
Я даўно чакала.
Запрашаю за стол сесць
Госця-генерала.

Налучыўся тут мядзведзь
На такое дзіва.
— Цьфу, няма на што глядзець! —
І ўсміхнуўся скрыва.

Усхапіўся верабей,
Адважны задзіра,
Як падыме крык: — Не смей
Зневажаць мундзіра!

Загрудкі мядзведзя — цап:
— Ведай, з кім заняўся!
Ледзьве з вераб'ёвых лап
Мішка ўратаваўся.



## КАЗКА БЕЗ КАНЦА

Выйшаў я на ганак
І ем абаранак.

Падбягае Янка:
— Дай абаранка.

А я кажу: — Не.
А ён — на мяне.

Грымнуў абаранак,
Разбіўся аб ганак,

Рассыпаўся ў крошкі,
Прыбеглі дзве кошкі

І адзін сабака.
Я з гора заплакаў,

Пайшоў тату жаліцца,
А тата пытаецца:

— Як і з-за чаго,
Хто першы — каго?

Стаў я свайму татку
Расказваць спачатку:

— Выйшаў я на ганак
І ем абаранак...

Тата кажа: — Хлопец,
Мне ўсё ясна — хопіць!

## КАШЧЭЕВЫ ХАРЧЫ

Залучыў Кашчэй
Чараду чарцей
Паначы за харчы
Карчаваць карчы.

— Я, мужчынкі, сам пашчу,
Але шчодра заплачу
Вам за карчаванне:
Прыкачу кацёл баршчу,
Цэлы чан мачання.
На пачостку абяцаю
Вам чатыры чаны чаю,
Ну, а хто захоча кавы —
Проша, проша, пан ласкавы!

Што вучонага вучыць,
Як варочаць карчы!
Хто каго перакарчуе —
Смачны дух баршчу пачуе.
А шчаслiўчыку за ўдачу
Я прадбачу і прыдачу:
Прыімчыць мой пасланец —
Першы з прыпечка блінец
Грачаны,
Мой пане,

Мачаны
Ў смятане.

Не шкадуючы аддзячу
І таго нячысціка,
Хто ачысціць ад ламачча
Лядзішча да лісціка.
Сённячы ж па адвячорку
Пачынайце раскарчоўку...

Нашча чэрці шчыравалі
І кашчавага чакалі.
Ноч не харчаваліся —
Перакарчаваліся.

Дзень чакалі і яшчэ
Ноч і дзве — не йдзе Кашчэй,
Не імчаць пасланцы —
З печы, з жару блінцы,
Не чуваць мачанікаў,
Гарачых грачанікаў.

Кончылася карчаванне
Без баршчу і без мачання,
І без чаю, і без кавы —
Ашукаў шайтан кашчавы!

Ад нішчымніцы чарты
Падкурчылі жываты,
Ачмурэўшы ад карчэўя,
Учарнеўшы з бесхарчэўя.

На Кашчэевых харчах
Валачашчы чорт зачах.
Не таўчэцца на вачах,
Не батрачыць па начах.

Чарцяняты не лайдачаць.
Гледзячы на нас, растуць.
А Кашчэя як убачаць —
Абмінаюць за вярсту.

## ЁЖКА

Я ўжо вам — не крошка,
Сама ў дзетсад хаджу.
Мая сяброўка — Ёжка,
Я з Ёжкаю дружу.

З якою? З тою самай,
З даўгімі валасамі,
З той самаю, ага,
Каторая — Яга!

Не хочаце — не верце,
Увесь пацвердзіць сад:
На Новы год к нам чэрці
Прыйшлі на маскарад.

Толькі мы пасталі,
Пабраліся за рукі,
А тут — яны з хвастамі,
І ўсе такія злюкі!

Ну, проста немагчыма —
Палохаюць дзяўчынак,
Настаўляюць рожкі,
Падстаўляюць ножкі.

Не вытрывала Ёжка:
— Дзевачкі, за мною!
Як дасць чарцям падножку
Нагою касцяною!

Чарцей як не бывала,
Нібы змяла мятла.
Зазіхацела зала
Усмешкамі святла.

Зноў карагод дзяўчынак
Павяла ўкруга
Навакол яліны
Мілая Яга.





Так песню выцінае,
Нагою тупаціць.
Няўжо ёй касцяная
Ніколі не баліць?

— Ах, дарагая Ёжка,
Тупай, ды глядзі —
Касцяную ножку
Не падверадзі.

Прыпыніся, мамачка,
Адсапіся трошкі...
Яга скідае тапачкі,
А пасля — панчошкі,

І ад здзіўлення карагод
Да вушэй разявіў рот.
Усім такія б ножкі,
Як у нашай Ёжкі!

А ёй было замала
Гэтакага дзіва —
Ніц галавою стала,
Стаяла з паўгадзіны,

Радасным урокам
Цешачы гасцей
І тых, хто скокам-бокам
Цёрся ля чарцей.

Глядзяць зачараваныя
І госці і дзетсад:
— Просім, паважаная,
Нам зрабіць даклад.

Такіх на свеце мала,
Што ні гавары,
Каб так стаялі ўдала
Нагамі дагары.

Дзе вы навучыліся,
Хто вам дапамог,
Як вы налаўчыліся?
— А мой дзядуля — ёг.

Дзедаву навуку
Спасцiглі пакрысе
І сыны, і ўнукі,
І праўнукі — усе.

Сягоння ёгі ў модзе,
Але мае сябры
Ўжо не стаяць, а ходзяць
Нагамі дагары.

І каб пайшла навука
У нас яшчэ ямчэй,
Нам трэба на парукі
Узяць усіх чарцей.

Я вас запытаю,
Хто адказаць гатоў —
Чаго нам не хапае?
Сказалі ўсе: — Хвастоў!

— Яны не вінаватыя...
— Вярнуцца ім пара...
Як закрычаць хвастатыя
З усіх куткоў: — У-р-ра!

І каб віну загладзіць
Хоць бы пад канец,
Як пачалі вылазіць
Хто з кухні, хто з сянец,

Хто з-пад стала, з-пад ложка
Да нас на маскарад,
Слухаючы Ёжку
І яе загад...

Вось якая Ёжка,
З каторай я дружу
І адной дарожкай
У дзетсад хаджу.

## ХТО ПАМАГАЕ СОНЦУ

У вясновы доўгі дзень
Так яно папрацавала,
Што, зняможанае, ў цень,
Дзе стаяла, там і ўпала.

І праспала усю ноч
На балоце каля пушчы.
Рада ўстаць — не можа воч
Ні падняць і ні расплюшчыць.

Што рабіць і як тут быць —
Сонца беднае не знае.
Стаў пастух яму трубіць,
Бачыць — не дапамагае.

Стаў ён выганяць кароў —
Ні адна не йдзе на пасту.
Між палёў, лугоў, бароў
Соннае пануе царства.

Не здагадваецца свет,
Што мінула ўлада ночы.
Дзецi снедалi ў абед,
Спалі —
хто калі захоча.

І такі пайшоў бязлад,
Што не ўцяміць і старому.
Дзед прывёў унука ў сад,
Калі ўсе пайшлі дадому.

Мамы ў яслі малышоў
Валаклі пасля работы.
Тата ў магазін пайшоў,
Маміны абуўшы боты.

Вучні ўсталі, зноў ляглі,
Бо гадзіннікі стаялі,
Ўсе ж яны па сонцу йшлі,
Пеўні беспрабудна спалі.

Заблыталася ўсё ў той дзень,
Не разблыталася б, мусіць,
Каб на вязе на гняздзе
Не прачнуўся стары бусел.

Выйшаў на шырокі двор,
Глянуў у прастор бясконцы.
Не знайшоў на небе зор,
А над забалаццем — сонца.

Перадаўся буслаў страх
Ад суседа да суседа.
Махануў за птахам птах,
Прыляцелі ўсе да дзеда.

Кожны ведаў, што рабіць.
Глянулі з вяршыні вяза —
Бачаць, сонейка не спіць,
Сонейка ў дрыгве завязла.

Мітусня і валтузня
Не па ўласнай там ахвоце.
Б'ецца, беднае, паўдня,
Ледзьве бачнае ў чароце.

Промень даў нырца — і ўсплыў
На лістку, як на далоньцы.
Падхапіліся буслы
Памагчы усходу сонца.

Падчапілі — паднялі!
Колькі сілы — глянуць люба:
Шар чырвоны па зямлі
Коцяць, аж мільгаюць дзюбы.

Выкацілі на грудок.
Пад нагамі прысак дыша.
Сонейка ступіла крок
І пайшло ўсё вышай, вышай.

Вось смяецца з неба нам,
Шле ласкавыя праменні,
А сябрам сваім — буслам
З пакалення ў пакаленне

Кожнай раніцай яно
Дзякуе за дапамогу —
Не забыла, як вясной
Апалілі птушкі ногі,

А не кінулі ў бядзе
Аднаго з балотам біцца.
Болей сонца ўжо нідзе
Спаць у багну не лажыцца.

Знае, што яму рабіць,
Калі загадзя прачнецца.
Пастуху не варт трубіць —
Раніца ў свой час прачнецца.

Ведайце, сябры мае,
Добрую прывычку мае
Той, хто рана устае —
Сонейку дапамагае.

## ЛІДАЧКА І ХМАРА

— Мама, я цябе парадую,
Ёсць усім загад такі:
Брыгадзір сказаў па радыё —
Нам ісці на буракі!

— Лідачка,— спытала мама,—
А хіба ж табе таксама?
— Ён сказаў: — Усе ідзеце —
І дарослыя, і дзеці.

Пойдзем грамадой вялікай
Ратаваць наш агарод.
Кожны хай бярэ матыку —
Там такі парос асот,
Малачай і лебяда —
Проста гора і бяда.

На праполку, на праполку!
Не спазніцца нам бы хоць.
Нездарма ж і перапёлка
Звала звечара: — Палоць!

— Ты, дачушка, і падняць
Не адолееш матыкі.
— Мамачка, я буду рваць
Той асот і пырнік дзікі.
Добра знаю я свірэпку,
Жоўтую яе берэтку,
Крапіву, іванаў чай,
І драсён, і малачай.

Бач, ужо выходзяць людзі.
Мама, і мяне вазьмі.
Табе сорамна не будзе
За дачку перад людзьмі.

Узяла матуля дочку,
Полудзень, вады біклажку...

— Вось вам вашыя радочкі
На дваіх — не будзе цяжка?—

Глянуў добрымі вачыма
Брыгадзір, не строгі з віду,—
Колькі ж год табе, дзяўчынка?
— Пяты,— адказала Ліда.

Заняла радок, пагнала.
Паляцелі ў завірусе
Сівыя з асоту вусы
І берэткі
Са свірэпкі,
Нават вушы з малачаю...
Ліда ажно заспявала:
— Мама, я радок канчаю!

Толькі што гэта за ліха —
На другім радку прыціхла.
Здаўся ён такі бясконцы,
Што прыцьмела нават сонца.

— Мусіць, мамка, канчаць трэба?
Бач, замурзваецца неба?
Расце хмара — будзе дождж!
Глянуў брыгадзір: — Ну што ж,

І на хмару ёсць управа.
Тут такая, Лідка, справа:
Каб знайшоўся ў нас ахвотнік,
Добры, кемлівы работнік —
Завярнуў бы хмару тую,
Хай у іншы бок прастуе...

— Я пайду і завярну! —
Падахвоцілася Лідка,—
А ў якую старану?
— Лідка, як табе не брыдка,—
Дзядзька брыгадзір жартуе...

Брыгадзір нібы не чуе:
— Куды хочаш завярні,
Абы нас яна мінула.
Бачыш, як хвастом крутнула,
Быццам джгаюць авадні?

Паглядзі — зусім жа нізка,
Як дастаць рукою — блізка.
Не паспееш носа ўцерці,
Зможаш граблямі падперці.

Пакуль ногі не паслаблі,
Ухапіла Лідка граблі,
Пайшла хмару падпіраць,
Брыгадзіру памагаць.

А назад — узлескам, лугам
Выбегла на сенажаць.
Тут касцы насустрач — цугам,
Косы вострыя звіняць.

— Куды, Лідачка, хадзіла?
— Па загаду брыгадзіра
Вунь на самы край зямлі,
Дзе дугой гарыць вясёлка.
Нашы сённячы змаглі
Ўправіцца-такі з праполкай!

Брыгадзір наш будзе рады,
Я дала ўсё ж хмары рады:
Граблямі яе прыгнула
І на захад павярнула...

Што было, тое было,
Не было, дык быць магло.
Па душэўным абавязку
Стаўлю я дзяўчынку ў казку,
Бо дазнаўся кагадзе:
Наша Ліда ўсім надзіва
Зарабіла ў брыгадзіра
Аж дзве нормы за той дзень!

## КАЗКА ПРА ЗЯЗЮЛЮ

За лазовым пералазам
Загуменнага завулачка,
На аселіцы за вязам
Лён пасеяла зязюлечка.

Ні часіны не згуляла,
Рупілася, даглядала,
А паспеў лянок — парвала,
У снапочкі павязала.

Паглядзела на снапочкі
І заплакала зязюля:
— Дзе мае сыны і дочкі,
Для каго мне шыць кашулі?

Зарыдала, закувала...
І пайшлі скрозь пагалоскі:
Не раса на поле пала,
А зязюльчыныя слёзкі.

І цяпер яна кукуе,
Адзіноту праклінае.
Хто сівую пашкадуе,
Сіраце паспачувае?

За лазовым пералазам
Болей я не быў ні разу,
Ды не мог забыць ні разачку
Даўнюю, старую казачку.

Завязаўся горкі вузел
Там у полі, ў лесе, ў лузе.
А хто зможа і развяжа —
Казку новую раскажа.



## КАЗКІ І КРАСКІ

З чаго пачынаецца сонечны дзень?
Вядома, што з новае казкі.
Зірніце, ледзь дакрануўся прамень
Лясной серабрыстае краскі —

Зазіхацелі кроплі агню,
Апошнія пацеркі ночы,
І праз настылую цішыню
Выбіўся кволы званочак.

Ашчадна жамчужную іскарку дня
Ландыш нясе у далонях.
Спіць яшчэ ўся палявая радня,
Накрыўшыся коўдрай зялёнай.

Першы прачнуўся Дзядоўнік стары,
Але не ўстаюць без прынукі
Дзеці, што любяць паспаць на зары,
І асабліва — унукі.

Цяжка, вядома, што ні кажы,
Бачыць старому без жалю,
Як тоненькі Дрыжнік спрасонку дрыжыць,
Як туліцца Піжма ў піжаму.

Даўно ўжо з далёкай дарогі прыйшлі
Зачараваныя Брат-і-Сястрыца
І ў захапленні глядзяць на палі,
На хвалі густое пшаніцы.

Маці-і-Мачыха над ракой
З дачкой абнялася няроднай.
Не знае, якой прытуліцца шчакой —
Цёплаю ці халоднай.

Прачнуўся касматы, нячэсаны Сон,
Вылез з начное кашулі.

Сее зязюля на купіне Лён,
Гусі саджаюць Цыбулю.

У кожнага клопат пра свой агарод,
Кожны свае даглядае расліны:
Казёл з казою — Казлабарод,
Свіння — Свінакроп, журавель — Журавіны.

Век не было гультаёў у бары,
Ахвотнікаў на дармоўку.
На расцяробах самі зубры
Сеюць сваю Зуброўку.

Дружна ўзяліся расці Львіны зеў,
Конскае шчаўе, Каціная мята,
А Кураслеп адцвісці паспеў —
Будзе ўраджай багаты.

Будуць ад працы і плён, і спор,
Калі гаспадар харошы.
Не налюбуюцца мышы з нор
На сіні Мышыны гарошак.

Добра ўрадзіла з самай вясны
Сёлета ў зайца Капуста.
Рад, як ніхто, агароднік лясны —
Грады буяюць густа,



А качаны так і гоніць у рост,
Толькі сабраць бы ўдала...
Глянуў, а за кустом — Лісахвост!
Спалохаўся заяц — і драла.

Умее хавацца ў пушчы мядзведзь,
Пытай — не падкажуць і птушкі.
Не давядзецца самога сустрэць,
Зірні на Мядзведжыя вушкі.

У лапцях хадзілі калісьцы ваўкі,
Зараз — у чаравіках,

Але застаўся ўспамін на вякі —
Барвовае Воўчае лыка.

Ёсць Воўчыя ягады і грыбы.
Іх людзі прыдумалі лоўка,
Абы каб самім іх не есці, абы,
Як кажуць, на воўка памоўка.

Аднак жа ад ядавітых траў
Трэба умець бараніцца.
А ты, каб убачыў, ты б іх пазнаў:
Вароняе вока, Куколь, Чамярыцу?

А ты на двары каля дому гатоў
Адрозніць ад красак увесну:
Блёкат, Цыкуту, Балігалоў,
Люцік, Паслён і Пярэсну?

А ці пазнаеш на пустках, ля ям,
Без імянных таблічак,
Як буйна бушуе пан Дурнап'ян,
А побач — паніч Дурнічнік?

Кветкі людскія імёны бяруць,
Ёсць Васількі, Маргарыткі,
Наша здароўе яны берагуць,
Нашы шануюць набыткі.

Бывае, і паджартуюць парой
Над слабасцю чалавечай.
Зёлка па імені — Зверабой
Нікога не б'е, не калечыць.

Прастудзішся — заварыць папрасі
Маліны, Дзіванны, Руты,
Усім прыбаўляе сіл Дзівасіл,
А Валяр'ян у нас доктар славуты...

Вірыць над Сланечнікам радасны рой,
Смокчуць салодкае сонейка пчолы,

І чмель з неразлучнай чырвонай трубой
Вандруе ў паход свой вясёлы.

Адзін авадзень ашалела гудзе
І вывіжоўвае вокам —
Якую хутчэй яму высачыць дзе
Ахвяру непадалёку.

Іван ды Мар'я аднойчы ўвесь дзень
Марна шукалі сыночка.
Бачылі, як ухапіў авадзень,
Хацеў ухапіць ён і дочку.

Анюта на тую хвіліну якраз
Зёлкі на поплаве рвала.
Ад крыўды зрабілася кветкаю ўраз,
Што брата не ўратавала.

І хоць яна голасу не падае
Ні ў лузе і ні ў лясочку,
Але хто ні гляне — убачыць яе,
Пазнае Анюціны вочкі.

У казках ігрушы растуць на вярбе,
Грамаце вучыць варона сароку.
Гавораць, знайшоўся адзін верабей,
Што возера выпіў у спёку.

Ад спёкі ў гаі дзяды-салаўі
Ратуюцца Іван-чаем.
Норма ў іх — самавар на дваіх,
Асушаць, другі закіпае.

Тым часам зямлю ўжо ахутвае змрок,
Клубіцца туман на балотах.
Пара маладым салаўям на урок —
Новыя песні развучваць па нотах.

Весела дзённая казка ідзе,
Бае, што бачыць і чуе,

І за сабою сяброўак вядзе —
Вячэрнюю і начную.

Гэтак за днём і мінаецца дзень,
Ночкай змяняецца ночка.
Строга трымаецца ранні прамень
Малога свайго званочка.

Толькі кранецца раніцай ён
Лясной чарадзейнае краскі —
Звоніць сярэбраны тэлефон:
Слухайце, слухайце казкі!

# Загадкі





## ДЗЕДАЎ КАРАБЕЦ

Стары дзед Усявед
Абышоў цэлы свет.
Вяртаўся дадому,
Нёс гасцінцы малому.

На парозе сянец
Свой паставіў карабец.
Калі ласка, ўсе, хто хоча,
Адмыкайце замочак.



Хто хутчэй адамкне,
Хай шапне
На вушка мне —
Што ж у тым карабцы.
Адгадалі?
Малайцы!

Даставайце
Па парадку,
Разбірайце
Загадкі.

## БРАТЫ

Пабывалі ва ўсім свеце,
Вандравалі на ракеце,
Удваіх браты не раз
Бачылі Венеру, Марс,
А сустрэцца не могуць,
Хоць жывуць цераз дарогу.

*(Вочы.)*

## У ДЗВЮХ МАТАК

У дзвюх матак
Па пяцёра дзіцятак,
І ўсе аднагодкі:
Трое доўгіх,
Двое кароткіх.

Назваў бы вам я
Кожнага імя,
Ды вы самі знаеце,
Самі адгадаеце.

*(Рукі і пальцы.)*

## ПОВЕН ХЛЯВЕЦ

Повен хлявец
Белых авец.
Добра жывецца,
Лёгка жуецца
Дружнаму статку.

Хто засмяецца —
Скажу вам адгадку.

*(Зубы.)*

## СЁСТРЫ

Расчашу сама адну,
Сама заплятуся,
А другое не крану,
Пагладзіць баюся.

Шасне грэбень востры —
Травы ніц кладуцца.
Што гэта за сёстры,
Як яны завуцца?

*(Каса, якою косяць,
і жаночая каса.)*

## КРУГЛЫ, ЯК СОНЦА

Круглы, як сонца,
Шыпіць пад ім донца.
Падрумяніцца бачок —
Скоціцца на ручнічок.

*(Блінец.)*

## НА ПАЛАЧЦЫ

На палачцы — галачка,
Халодная качалачка,
Аб губачкі трэцца,
Просіцца пагрэцца.

Ты яе паліжы
І на вушка мне скажы —
Як яна завецца?

*(Марожанае.)*

## СЯДЗІЦЬ МІКІТА

Сядзіць Мікіта,
Глядзіць сярдзіта
Адным вокам
Са сцяны —
Ці далёка
Сыны.

*(Сук.)*



## ТРАВУ ТРУ

Траву тру —
Зубы туплю,
Пяску ўхаплю —
Зноў навастру.

*(Каса.)*

## БРАТ І СЯСТРА

Брат сястру пабачыць рад,
Але строгі ў іх расклад:
Прачынаецца сястра —
Брату спаць ісці пара.

*(Сонца і месяц.)*

## СЯМ'Я

Дуб-дубавін,
Дванаццаць галін.
На кожнай галіне
Чатыры гняздзіны.
У кожным гняздзечку
Па сем яечкаў.
Кожнае мае
Сваё імя.
Хто адгадае —
Што за сям'я?

*(Год, месяцы,
тыдні і дні.)*

## КОНЬ

Такі рахманы,
Такі паслухмяны,
Сам гліняны,
Рот палымяны,
У горле агонь,—
Які гэта конь?

Хто цэлую зімку
Гладзіць яго спінку?

*(Печ.)*





## МАЦІ, ДАЧКА, СЫН

Маці — таўстуха,
Дачка — пякуха,
Схапіў сынок
Паясок,
Да аблокаў
Павалок.

*(Печ, агонь і дым.)*



## НЕ ПЫТАЙСЯ Ў МАМЫ

Не пытайся ў мамы —
Сам гавары:
Хто бегае над намі
Нагамі
Дагары?

*(Муха.)*

## ПАД АДНЫМ БРЫЛЁМ

Пад адным брылём
Чатыры браты.
Зойдзеш у дом —
Убачыш іх ты.

*(Стол.)*

## БАБУЛЯ

Хоць бабуля злая —
Нікога не чапае.

Але кожнаму дасць здачы:
Хто пакрыўдзіць —
Сам заплача.

*(Цыбуля.)*

## У ЯРЫ ХАВАЮСЯ

У яры хаваюся,
Ў берагах бягу,
За гару хапаюся —
Устаць не магу.

Калі б толькі ўстала,
Да неба б дастала.

*(Рака.)*

## СЯКУ, СЯКУ



Сяку, сяку
Уздоўж раку,
Еду, еду —
Ніякага следу.

*(Човен.)*

## ЗА ТРЫ ВАЗЫ

За тры вазы дзеразы
Купіў тата тры казы.
А ці кожнаму вядома —
Па чым козы йшлі дадому?

*(Па дарозе.)*



## З-ПАД КАПЕЛЮША



З-пад капелюша,
З-пад капялюшычка
Даставалі спарыша
У пялюшачках.
Вылузвалі са шкарлупкі —
Забалелі нашы зубкі.

*(Арэх.)*

## У МАЛЕНЬКАЙ ХАЦЕ

У маленькай хаце
Гэтулькі багацця
Ды такога смачнага...
Каб толькі вы пабачылі,
Каб толькі паспыталі —
Адразу б адгадалі.

*(Вулей.)*

## З ЦЁМНАЙ ХМАРЫ

З цёмнай хмары наўскасяк
Скочыў на зямлю басяк
І пусціўся басанож.
Вы яго пазналі?

*(Дождж.)*



## ВАДАВОЗ

Заліхвацкі вадавоз
Воз вады па небе вёз,
Гэтак грукацеў вядром,
І мы ўсе пазналі...

*(Гром.)*

## СТРАШНЫ ЗВЕР

Пасля дожджыку ў чацвер
З лужы вылез страшны звер:
— Ква, ква, ква! — усіх спужаў бы,
Калі б мы не зналі...

*(Жабы.)*

## СЕМ ВЯСЁЛЫХ МАЛЯРОЎ

Сем вясёлых маляроў
І такіх, што будзь здароў —
Аж паўнеба распісалі.
Выйшла што — не знаюць самі.
Той, напэўна, адгадае,
Хто часопіс наш чытае.

*(Вясёлка.)*

## НІВЕРМА

Пападумаў я нямала —
Намаганні ўсе дарма:
У — адпала, Г — прапала,
Што такое ніверма?

*(Універмаг.)*

## ІНДЫКОВА ЗАГАДКА

Па вуліцы — дыб, дыб —
Важна дыбае індык,
Подбежкам індычукі,
А за імі — хлапчукі.

Куды, завадатар?
— Заводзіць экскаватар.

Што ты будзеш рабіць?
— Гару Лысую рыць.

Што там пад Лысай?
— Медная міса.

А што ў місе?
— Залатая лыжка.

А што ў лыжцы, братка?
— Дробнае зярнятка.

Для чаго зярнятка?
— А засеяць градку.

Адцвіце градка —
Будзе вам загадка:
Поўная скрынка
Салодкіх круп,
Знізу — тычынка,
Наверсе — чуб.
Хто адгадае —
Той паспытае.

*(Макаўка.)*

## ЗАГАДКА ПРА ЗЯРНЯТКА

Колькі вас усіх тут ёсць,
Кожнаму дам па зярнятку,
Кожны дарагі мой госць
Хай паслухае загадку:

У калысцы спіць зімою,
А вясною, як прачнецца,
Промню цёпламу ўсміхнецца,
Прыхінецца галавою

Да братоў сваіх — блізнятак.
І ўжо кожны набірае
І да сонца падымае
Жменю залатых зярнятак.

Гляньце, як браты-умельцы
Па зярнятку і па жменьцы
Гэтулькі сабралі збожжа,
Што падняць ніхто не можа.

Вунь вясёлка прабавала,
Мабыць, сем разоў, не меней,
Той набытак небывалы
Зважыць на сваім бязмене.

Пастаяла над зямлёю,
Бачыць, марна траціць сілу
І, сагнуўшыся дугою,
Ледзьве злезла з небасхілу.

І тады аж сем вясёлак,
Сем вясёлак па сем столак
Падхапіліся заўзята
Зважыць ураджай нязжаты.

Прымяралі так і гэтак,
Перабралі план за планам:

Як зручней падняць палетак —
Ці каромыслам, ці кранам?

Разлічылі ўсё як трэба:
У сем столак трос напяты,
А паміж зямлёй і небам —
Каляровыя канаты.

Ды не ўсё так выйшла гладка
І так лёгка, як здалося,—
Аніводнага зярнятка
Не ўтрымалі тыя тросы,

Разляцеліся канаты.
Вось які ўраджай багаты!
Бо і сейбіт, і араты
Працавалі не на жарты.

Стары колас водзіць вусам,
Аглядае ўсе сцяжынкі,
Засцілае стол абрусам,
Запрашае на зажынкі.

Не сядзіцца перапёлцы,
Лічыць, колькі ў нас дабра,
Па каліву, па саломцы:
«Жаць пара! Жаць пара!

Толькі з гэтаю сцяной,
З неабсяжнай паласой
Мне не справіцца адной
Ні з сярпом і ні з касой».

Хто ж абдыме
Той прастор
І падыме?
КАМ-БАЙ-НЁР.

# Задачкі





## ПРА ПАНЧОШКІ І РУКАВІЧКІ



— Пасядзі спакойна, Вася,
Па баках не аглядайся,
Не чашы, браток,
За вухам,
А яшчэ разок
Паслухай:

«Маша коціку на ножкі
Падарыла панчошкі,
А малой сястрыцы —
Панчошкі і рукавіцы.
Колькі пар было панчох,
Колькі рукавіц?»

Уздыхнуў хлапчына: — Ох!
Нос павесіў ніц.
— Дзед, задача не для нас.
Трэба склікаць увесь клас.

— Ты, Васіль, не ўмееш слухаць,
Вось што я табе зазначу.
Набярыся, хлопча, духу,
Сам рашы сваю задачу.
А пасля паклічаш клас —
Ёсць задачкі для ўсіх вас.

*(Тры пары панчох,*
*адна пара рукавіц.)*



## У КОЖНЫМ КУТКУ

У кожным кутку
Ў хаце па катку.

Кожны сядзіць,
На траіх глядзіць.

Колькі ж куткоў
І колькі каткоў?

*(Чатыры куткі,
чатыры каткі.)*

## У СТАРОГА ВЕРАБ'Я

У старога вераб'я
Грашавітая сям'я:
У кожнага верабейкі
Па чатыры капейкі.

Зляцеліся вераб'і —
Налічылі два рублі.
У самога вераб'я
Было роўна паўрубля.
Кожнаму верабейку
Даў стары яшчэ капейку.

Колькі ж мае дзяцей
Наш багаты верабей?

*(Пяцьдзесят.)*

## ВЕРАБ'ІНАЯ ЗАРПЛАТА

Вераб'іная зарплата —
Пяць капеек на брата,
Пяць капеек на сястрыцу.
Толькі як нам палічыцца?

Раскладаем, дзелім, множым,
А сябе злічыць не можам.
Два рублі рублямі,
Рубель пятакамі,
Пяць капеек па капейцы.
Колькі ўсіх нас у сямейцы?

*(Шэсцьдзесят адзін.)*

## КОЛЬКІ ПАЛЬЦАЎ?

Колькі пальцаў на руцэ?
Кожны знае: — Пяць.
Добра, што адразу ў цэль
Можаш ты цаляць.

Добра, толькі не спяшы,
Хай другія рэшаць.
А на дзвюх руках, скажы,
Колькі будзе? — Дзесяць.

Не зрабіць бы нам прамах
У задачцы трэцяй:
А на дзесяці руках
Колькі пальцаў, дзеці?

*(Пяцьдзесят.)*



**НА ВЯРБІНЕ**

На вярбіне —
Тры галіны,
На кожнай галіне
Па тры апельсіны.

Колькі нарвеш,
Усе і паеш.

*(На вярбе апельсіны
не растуць.)*

**МАЯ СЯМ'Я**

Задам табе задачу я.
Паслухай, вось мая сям'я:
Дзядуля, бабка, брат.

У нас парадак, лад,
Заўсёды чыста ў хаце,
Бо ў хаце ў нас дзве маці,
Два бацькі, два сыны,
Дачка, пляменнік і сястра,
А самы меншы — я.

Цяпер табе злічыць пара —
Якая ў нас сям'я?

*(Бацька, маці, сын,
нявестка, унучка і ўнук.)*

## РАЗРЭЖЦЕ САМІ

Шэсць метраў шоўку
Купіла швачка
Дочкам на абноўку,
А вам — на задачку:

Штодзень нажнамі
Адрэзвала маці
Па метру для кожнае
І шыла плацце.

Колькі дзён шоўк
Рэзала швачка?
Якраз для малышоў
Гэта задачка.

Размерайце самі,
Раздзяліце самі,
Нарэшце
Разрэжце
Сваімі рукамі.

*(Пяць дзён.)*



## КОЛЬКІ САРОК?

У нядзелю на урокі
Прыляцелі ўсе сарокі,
Бо не ведалі яны,
Што ў нядзелю выхадны.

Ў панядзелак на урок
Прыйшло сорак
Сарок.

У аўторак за буквар
Яшчэ села дваццаць пар.



Шэсцьдзесят
Сарачанят
Пагуляць зайшлі
Ў дзетсад.

Калі ў школу на заняткі
Вернуцца сарачаняткі
І пасядуць за урок —
Колькі будзе ўсіх сарок?

*(Сто сорак сарок.)*



## ПЯТЫ

Чатыры салдаты
Лічылі пяты,
Далучыўся пяты:
— Залічыце мае пяты.

Падышло дваццаць
І яшчэ пятнаццаць.
Пяць сказалі: — Братцы,
Трэба разабрацца:

Сорак пят
І сорак пят —
Колькі ж нас
Усіх салдат?

*(Сорак салдат.)*

## ЛЯЦЕЛІ ГАЛУБЫ

Ляцелі галубы,
Селі на дубы —
Па пары на кожны.
Зірнулі ўбок,
А адзін дубок —
Парожні.
Паасобку рашылі сесці —
Аднаму не хапіла месца.

Колькі дубоў,
Колькі галубоў?

*(Чатыры галубы
і тры дубы.)*

## ДВА САМАЗВАЛЫ

Два самазвалы грузілі пароўну:
Бетон — Антону, Сымону — воўну.
Тону — Сымону, тону — Антону.
Хто на пытанне задачы адкажа:
У каторага большая будзе паклажа,
Каторы з месца кранецца хутчэй,
Катораму ехаць будзе лягчэй?

***(Большая паклажа будзе на самазвале з воўнай, меншая — на самазвале з бетонам, а вага ў абодвух аднолькавая.)***

# Госці





## ПРЫЛЯЦЕЛІ ГОСЦІ

Прыляцелі госці,
Селі на памосце,

Сталі сакатаці,
Просяць есці даці.

Вазьму ў сенцах сіта,
Вынесу ім жыта.

З рукаўца-мяшэчка
Пачастую грэчкай.



Дам паўрукавіцы
Ярыцы-пшаніцы,

Кіну ўсім патроху
Бобу і гароху,

На закуску жменю
Сыпану ячменю.

Прыляцелі госці —
Частункі выносьце:

Старому —
Арэшкі,
Малому —
Пацешкі.

## АЛЯПКА

Там, дзе рэкі і азёры,
Гэта птушка на дазоры.
І мароз ёй не бяда,
Не замерзла б вада.

Ёй не золка і не зябка —
Любіць рыбку аляпка.
Як убачыць пад вадой —
Р-раз нырца галавой,

Вострай пікай дзеўбане
І пайшла далей па дне.
Над яе няма плыўца,
Няма лепшага нырца.

Што там нашы маржы —
Лепш пра іх не кажы!

## КРЫЖАДЗЮБ

Гляньце вы на дзівачка,
Што з гняздзечка-гамачка
У завею, у мароз
Высунуў дзюбаты нос.

Гэта смелы крыжадзюб,
Не баіцца ён завей.
Лес яловы вельмі ж люб
Для яго малых дзяцей.

Любата для птушанятак
У гняздзечку ў гэты час —
Ёсць і шышак і зярнятак
Аж на ўсю зіму запас!

## ГІЛЬ

Мы яго не толькі ў кніжцы,
Бачылі ў садку.
У чырвонай ён манішцы,
Шэрым пінжаку.

Ссунуў шапачку на вочы,
Хвосцікам — віль, віль.
Жыць у клетцы ён не хоча,
Любіць волю гіль.

## АМЯЛУШКА

Ці прыйшлося з вас каму
Бачыць гэту весялушку?
Зрэдку, толькі на зіму,
Прылятае амялушка.

Скача госця па рабінцы
У чырвонай касынцы.
Адну гронку абірае,
На другую паглядае.

Без турбот яна не ўседзіць,
Усе кусцікі агледзіць —
І ядлоўцу, і амелі.

А зацíхнуць мяцелі,
У шчаслівую гадзіну —
Зноў на поўнач, на радзіму!

## ШЧЫГОЛ

Крыльцамі крутнуў,
Блiснуў лампаскай,
Дзюбай праткнуў
Чырвоную маску,

Насунуў на вочкі
І рад, што схаваўся,
А я па званочку
Твайму здагадаўся —

Хто на галінцы
Завязь патузвае,
Хто на былінцы
Зярняткі вылузвае,

Хто на дасвецці
Раніцай чыстаю
Дзецям на флейце
Песні высвіствае.



## ДЗЯТЛІК

Часта ён ад дзеда
Чуў, калі падрос:
— Хто б цябе, брат, ведаў,
Каб не доўгі нос.

Няпраўда нялюба,
А ўнучак прывык,
Хоць даўжэй за дзюбу
У яго — язык.

## ЖАЎНА

Чорны дзяцел здаўна
Называецца — жаўна.

У чорнага волата —
Магутнае долата.

Дзеўбане ў сасновы сук —
Па ўсім лесе грыміць грук.

Ён не думае пра спевы —
Чорны дзяцел лечыць дрэвы.

## ПЛІСКА

Каля рэчкі блізка
Скача, скача пліска
На цыбатых ножках
У чорных панчошках.

Хвосцік толькі бліскае —
То ўгары, то нізка ён.
Плісачка ківаецца,
Дзеці пацяшаюцца:

— Вазьмі мяне, птушка,
На хвасце пагушкай.

## БУСЕЛ

Даўганогі землямер
Схапіў жабу за каўнер,

Па траве павалачыў,
У канаве намачыў,

Вострым носам дзеўбануў,
Уздыхнуў і — праглынуў.

## ЧЫЖ

Чыж у госці хадзіў,
Чыж з савою піва піў.

Як глынуў ён кроплі дзве —
Зашумела ў галаве,

Ледзьве бедны не самлеў,
Зусім чыжык асавеў.

Трэба нам яго злавіць,
Зноў у клетку пасадзіць.

— Чы-чы-чы, не хачу,
Лепш з савою паскачу.

## СЛАЎКА

— Чым праславілася, слаўка? —
Запытаў спявачку Слаўка.—
Чалавек — другая справа,
А табе завошта слава?
За ўсіх птушак выдатней
Пеў сягоння салавей.
Славачка-чарнагалоўка
Ледзьве вымавіла слоўка:
— Я з табою згодна, Слава,
Што на славу трэба права,
І віна у тым мая,
Што заместа салаўя
Для цябе спявала я.

## ПЕРАСМЕШКА

Што гэта за смешкі
З малога Цярэшкі,
З нашага пастуха?

Просіць Цярэшка:
— Прынясі арэшка,
А перасмешка:
— Ха-ха, ха-ха-ха!

Кажа перасмешнік:
— Палячу ў арэшнік,
Набяру арэшкаў
Аж чатыры мяхі,
Для равеснічкаў
Перасмешнічкаў:
Хі-хі, хі-хі-хі, хі!

Перасмешнік-жартаўнік,
Не хачу з табой дружыць.
Да людзей ты не прывык,
Толькі ўмееш дражніць.

## СЫЧ І САВА

Сядзіць сыч на капе,
А сава на слупе.

У савы пытае сыч:
— Ці ты чуеш, соўка, кліч?

Паляўнічы затрубіў
У трубу.

Каб хоць нас не загубіў —
Бу-бу-бу.

А сава сказала: — Не,
Ты паслухай лепш мяне:

Паляўнічыя ідуць —
Ух, ух-ух.
Ўсіх ваўкоў яны паб'юць —
Пух, пух, пух!

## СТРЫЖ

Стрыж, стрыж, пастрыжы.
Кажа стрыж: — Не магу.

А чаму ты, стрыж, скажы?
— Я паветра стрыгу.

Пакуль дзетак накармлю —
Аблятаю ўсю зямлю.



## ДРАЧ

Драч,
Драч,
Бяры
Дзяркач,
Дзяры
Дзёран.

А драч —
У плач:
— Я і так зморан.

Краў дровы на дрывотні,
Прастудзіўся ў падваротні.
Занядужаў нешта,
Саслабеў дарэшты.

Не кажы,
Драч,
Дарэшты —
Горла добра
Дзярэш ты.

## ВЕРАБЕЙ

Чы-чы-чы, верабей,
Не скачы, не дурэй.

Не паслухаў ён мяне,
Стаў скакаць па бервяне,

Хацеў злавіць мошку,
Зламаў сабе ножку.

Я каленца
Віраб'ю
Палаценцам
Пераўю.

На хворую ножку
Пашыю панчошку.

Чы-чы-чы, верабей,
Не скачы, не дурэй.

## ЧАЧОТКА

Скача чапля па балоце,
Чачотачка — у чароце,

А чубаты чачот
Топча, топча агарод.

Я чачота падпільную,
Чапялою пачастую.
Чаплі — шызапёрачцы,
Чачотцы — танцорачцы —

Неразлучнай парачцы
Паднясу па чарачцы

Чарнічнага кісялю
І мядком падвесялю,

Дам цётачцы чаплі
Кавалачак вафлі,
А чачотцы — чачавіцы,
Табе ж, чачот,—
Чамярыцы.

## ПЕРАПЁЛКА

З вечара і да відна
Ўсё заве мяне яна.
На хвілінку б сціхла хоць:
— Уставай! Ідзі палоць!

Я пайду злаўлю яе,
Бо гнязда ж яна не ўе
Ні ў дупле і ні ў галлі,
Зробіць ямачку ў раллі,
Высцеле травою —
Вось і ўсе пакоі.
Да зямлі ўсё туліцца,
Дзюбай жыта чэша,
А лятаць лянуецца,
Болей ходзіць пеша.

Я ўсё жыта абышоў
І гарахавішча,
Хітрай птушкі не знайшоў —
Днём яна не свішча.
Як нямая цэлы дзень,
А як ляжа ночы цень,
Выйдзе першая зара,
Закрычыць тады яна:
— Спаць пара! Спаць пара!
А сама не спіць адна
Аж да самага відна.

## ШПАК

Прасіў шпак вераб'я:
— Пасвішчы, браток, як я.

Верабей — і так і сяк —
Не, не ўмее ён, як шпак.

Не па сіле вераб'ю
Засвістаць: фію, фію!

## ЯСТРАБ

Паміж лясное гушчыні
Убачыце вы часта,
Як кідаецца з вышыні
Уніз дзюбасты ястраб.

Трывога! Крык! — і цішыня
Ізноў на кожнай хвойцы.
Хто ж засмуціў прыгожасць дня?
Забойца.

Не ловіць мошак ён, ні мушак —
Драпежнік забівае птушак.

## ГАЛКА

На двары дзяўчынкі
Лічыліся ў лічылкі.

Дасталі вяровачку,
Пазвалі сяброўачку:

— Ляці хутчэй, Галка,
Гуляць у скакалку!

Галка прыляцела
І на плоце села.

Хапіў хлопец палку
І шпурнуў у галку.

Села галка ў крапіву
І чухае галаву:

— Вось ты іх і зразумей,
Неразумных дзяцей —

Называюць галкай,
Сустракаюць палкай.

## ХТО ГЭТАК СПЯВАЕ

«Шатавіла-матавіла
Па-нямецку гаварыла,
Пела па-турэцку,
Плакала па-грэцку.
З носіка — шыльца,
А з хвосціка — вільца,
Спадыспаду — палатно,
На апашках — шоўк, шоўк.
Зазірнула я ў гумно,
Дзюбачкай: шчоўк, шчоўк.
Як у вырай адлятала,
Шмат дабра вам пакідала,
Не ўзяла ні жменькі.

Прыляцела, паглядзела —
Няма нічагенькі:
Усё чыста пералушчылі,
Перацерлі, ператрушчылі...
Што нажалі, накасілі —
Без мяне памалацілі.
Ці-лі, ці-лі,
Ці-лі...»

## ЛЕБЕДЗІ

Увалілася бяда
Ў лебядзіны агарод:
Забуяла лебяда,
Заглушыў усё асот.

Стары лебедзь
Лебяду цярэбіць,
Лябёдачка маладая
Малачай выбірае.

На градзе
Ў лебядзе
Лебядзёнак
Гудзе,

Малы
Лебядзёначак
Кагадзе
З пялёначак.



## САЛАВЕЙ

У зацішку вербалозаў ніцых,
Дзе лясная сочыцца крыніца,
Чыстай, свежае вады напіўся
І яшчэ званчэй і весялей
Серабрыстай пацеркай на нітцы
Затрымцеў і песняю разліўся
У альховым кусце салавей.

Галасны, увішны,
Слаўны ён спявак.
Светлая манішка,
Поверх — доўгі фрак.

Ён — і па-французску,
Ён — усімі мовамі,
А больш — па-беларуску,
Але сваімі словамі:

— Як у лядзе-лядзе
Пастух сала пёк-пёк,
Як прысядзе-сядзе
На пянёк-пянёк-пянёк,
Як пакр-р-руціць ён ражэньчык,
Ах, каб цябе, каб...
Сквар-р-ка — тр-р, кап-кап,
І няма — ўсю з'еў агеньчык...

## СІНІЦА

Цвінь-цвень! Пінь-пень!
Добры дзень! Добры дзень!

Хто гэта мяне вітае —
Ці шчыгол, ці слаўка гэта?
Не, вось блізка падлятае,
На сасновы сук садзіцца.
Углядаюся ў прыкметы,
Трэба ж так мне памыліцца —
Не пазнаў сваёй сініцы.

Прылятала гэта птушка
Да мяне штодня зімой,
Добрую зрабіў кармушку
Для сяброўкі я сваёй.

Пінь-пень! Цвінь-цвень!
Прылятай, мая сініца,
Зноў зімою кожны дзень,
Будзеш у мяне карміцца.

## ПЕНАЧКА

Пеначка-паненачка,
Жоўтая сукеначка,
Тонкія ножкі,
Патанцуй нам трошкі.

Кажа птушка пеначка:
— Я ўжо не паненачка,
Не весніца, не летніца,
А маці-мнагадзетніца.

Некалі мне танцаваць,
Трэба дзетак гадаваць.
У мяне ўжо тры дачкі
І сыночак от тачкі,
Маленечкі хлапчучок:
Чук-чок,
Чук-чок,
Просіць есці цэлы дзень:
Цінь-цень,
Пінь-пень.

## ГАРЫХВОСТКА

Пусціў погаласку дрозд:
«Ў гарыхвосткі гарыць хвост!»

Ад такое навіны
Недалёка да маны.

Хвост заўсёды мой палае,
А ніколі не згарае.

У мяне ён — нападрост.
Пазайздросціў,
Пэўна,
Дрозд.



**ДРОЗД**



Адкажы, чаму ты, дрозд,
Гэтак здорава падрос?
— Шмат увосень еў рабіны,
Ну, а гэта ж — вітаміны.

**ЗЯЗЮЛЯ**

Пэўна, вы вясною чулі,
Як на дрэве, на суку
Кліча на ўвесь лес зязюля:
— Ку-ку! Ку-ку!

Мне расказвала бабуля,
Хлапчуку яшчэ малому,
Што на ўсё жыццё зязюля
Адцуралася ад дому.
Родных дзетак не гадуе,
А калі знясе яечка,
Возьме ў дзюбку і цікуе —
Каму ўкінуць у гняздзечка.



Не люблю я гэтай птушкі,
Што малых не хоча гушкаць,
Не спяваць ім калыханкі,
Не вадзіць на пагулянкі
І не ў ладкі з імі пляскаць,
Не расказваць байкі-казкі.

## ФАЗАН

Родам з гор,
З вышынь Каўказа,
Што танцор —
Відно адразу.

Ён увесь тут на партрэце
Ў залатым сваім бешмеце.

На чаркесцы — узоры,
На шаўровых лапках — шпоры.

З-пад папахі набок
Выбіваецца чубок.

На грудзіне — газыры.
А хвост! Хіба ж не кінжал!

Што ты там ні гавары —
Ён вышэй усіх пахвал:

Безупынку, безунімку
Танцаваць гатоў лезгінку.

# ПТУШЫНАЯ ШКОЛА





## ЗВАНОК

Хто прыносіць нам вясну,
Сонцам поплаў меціць,
Будзіць поле ада сну?
Жаваранак, дзеці.

На раллі яшчэ лядок,
Не абсохла глеба,
Вестунок — за званок
І хутчэй у неба.

І звініць, звініць званок
У блакітным свеце.
Кліча нас на свой урок
Жаваранак, дзеці.



## УДОД

З галавы да плеч руды,
Сам стракаты і сівы.
Гэткай доўгае дуды
Не бачылі зроду вы.

Прычасаў свой чубок
І бярэцца за ўрок.
Сеў над кнігай: — Ду-ду-ду,
Скора ў школу я пайду.

Не вылазь з дупла, удод,
Не смяшы лясны народ.
Ты да школы не дарос,
Хоць і маеш доўгі нос.

## СОЙКА

У сініх пагонах,
Ружовых лампасах,
А горш за варону
Вучыцца ў класе.

Для сойчынай дзюбы
Чытанкі нялюбы.
Толькі возьме ў кіпцюры —
Ляцяць сшыткі, буквары.

Не дзіва, што ў сойкі —
Адны толькі
Двойкі.

## ЦЯЦЁРКА

Вось хто ў нас выдатніца,
Да навукі здатніца.
У шэрай цяцёркі
Па пісьму — пяцёркі.

— Таямніцы тут няма,—
Гаворыць цяцёрка,—
Я заўсёды сама
Чышчу сваё пёрка

І ніколі не спяшу,
Таму чыста пішу.

## САРОКА

З панядзелка да суботы
Мне вучыцца неахвота.
Каб дазволілі ў нядзелю —
Ў школе б цэлы дзень сядзела.

Белабокая хітрыца,
Разумніца вучаніца,
Непатрэбна нам такая —
Гультаёў сваіх хапае.

## КРУЦІГАЛОЎКА

Надта ж мянушку
Прыдумалі лоўка:
Назвалі птушку —
Круцігалоўка.

Надзіва ўдалася
З вёрткаю шыяй.
І ў нашым класе
Ёсць такія:

Не ступяць і кроку
Яны без падказкі —
Не ўспомняць урока,
Не раскажуць казкі.

Вухам так і водзяць —
Дзе пачуць бы слоўка,
Як на вербалозе
Круцігалоўка.

## СІВАВАРОНКА

Добра, дзеці, паглядзіце
І запомніце сяброўку,
Што пашыла з аксаміту
Сабе сінюю абноўку.

Наша госця — афрыканка,
Мілая сіваваронка,
Адлятае сёння зранку
У далёкую старонку.

Вольна ёй у нас жылося,
Не была ніколі ў крыўдзе,
Але вось настала восень,
Хутка замаразак прыйдзе.

Хай шчасліва ёй ляціцца
Цераз рэкі, горы, долы,
Самай слаўнай вучаніцы,
Выпускніцы нашай школы!

## КРАПІЎНІК

Гэта — казачны гном.
Не пабачыш днём
З агнём.

Колькі там яго — з арэх,
А не ўловіш — смех
І грэх.

Лепш у госці пазаву —
Не палезу ў крапіву.

## ІВАЛГА

Вам адно сказаць магу:
Не забудзьце ўсе, хто гляне,
Прыгажуню івалгу,
Птушку ў жоўтым сарафане.

У народзе ёсць прымета:
Івалга прыносіць лета.

## ППШ

Я спытаўся ў малыша:
— Што такое — ППШ?

Доўга думаў малыш:
— Ну й загадку задалі ж...

Думаў дзень, думаў два —
Забалела галава.

Вас цяпер я папрашу:
Памажыце малышу.

Хто адразу адгадае,
Хай руку ён падымае

І гаворыць: — Я гатоў
Растлумачыць тайну слоў...

Нешта ж доўга я чакаю...
Што? І з вас ніхто не знае?

Рук паднятых я не бачу.
Сам тады вам растлумачу:

Першым П стаіць вышыннае
І чытаецца: ПТУШЫНАЯ,

П, што выгнута падковаю,
Азначае: ПАЧАТКОВАЯ,

Ну, а што такое Ш —
Ясна і для малыша.

Пойдзеш з намі ў ПШ,
Ўсё, што ўбачыш, апішы.

А то, можа, ты ляўша,
Дык дзяцей лепш не смяшы.

Навучыся правай перш,
Тады сілу паспрабуй.

Хоч — пішы адразу верш,
Хоч — ракетаю кіруй.

— А хіба мы на ракеце?
Не, давайце пехатой.
Бачыце, як блізка свецяць
Літары на школе той,
На ўсю браму:
ППШ.

З-пад свайго капелюша
Пазірае на нас, дзеці,
Сам дырэктар, слаўны Пеця.

Пётр Пятровіч ён для вучняў,
Для мяне — друг неразлучны.

— Здароў, Пеця-Певунец,
Бурштыновы грабянец!

Ты даруй, брат, што я мусіў
Да цябе прыйсці з экскурсіяй.

Можа, мы прыйшлі зарана,
Што яшчэ ў вас не прыбрана,

Не расстаўлены і парты
І не вывешаны карты?

— Ат,— махнуў крылом дырэктар,—
Так бывае ў нас нярэдка.

Празвінеў даўно званок,
Не прыйшоў ніхто на ўрок.

Я прачнуўся на зары,
Сабраў сшыткі, буквары,

Па надворку пахадзіў,
Потым вучняў пабудзіў,

Па чарзе пачаў пытаць:
— Як умееце чытаць?

І ніводзін мой сынок
Не знаў урока назубок.

Ні адной задачкі
Не рашылі качкі.

Дзюбаю вадзіла гусь
І па карце лазіла,

Ўсё шукала Беларусь
Ў Афрыцы і ў Азіі.

Так шукала ўпарта —
Выдзеўбла ўсю карту.

А дачушка курачка,
Як зляцела з седала,

Выбегла на вулачку:
— Я ж яшчэ не снедала.

А ў нас сёння бліны,
Тата, дай мне выхадны.

Тары-бары, растабары:
Ты купі мне акуляры,

А то я не бачу,
Як рашаць задачу.

— Ты, малая, не хітры,
Не гуляй у жмуркі.

Колькі будзе 2+3? —
Я спытаўся ў куркі.

Адказала курка: —7.
Збегаю дамоў, пад'ем.

А пасля прыйду з дружком,
З выдатнікам індыком.

А выдатнік індык,
Ён старацца не прывык
Ні лічыць, ні пісаць





І не знае 5+5,
Толькі ўмее балбатаць:

«Блу-блу-блу,
Блу-блу-блу —
Вельмі ж я чытаць
Луб-лу».



Пяты год буквар дзяўбе,
А запомніў:
А і Б.

— Грамацей, грамацей,
Ты парадуй нас, гасцей.

Калі знаеш А і Б,
Дам загадку я табе:

Дзве сястрыцы, А і Б,
Добра гралі на трубе.

Памагчы заўсёды рад
Быў сястрыцам меншы брат.

Сам залез ён у трубу
І як крыкне: — Ту-бу-бу!

Чуюць сёстры — гук не той.
Ах ты, жэўжык, ну пастой!

А браток з трубы — скок, скок,
І няма — прапаў браток.

Папрабуй улаві
І самога назаві.
Назаві, назаві!
Хто падкажа, дзеці?..
— І!

А выдатнік індык
Сюды — пык, туды — мык:
— Брата іх не бачыў я.
Я не быў у трубе,
Знаю толькі А і Б.

Вось прывёў дырэктар нас
У свой самы лепшы клас.

— Гэта самы клас культурны.
Хто сягоння ў нас дзяжурны?

— Я, пляменнік ваш, Яўтух.
— А прозвішча?
— Пі-я-тух.

— Чаму стол на адной ножцы?
І адкуль у вас на дошцы
Тут кляновыя лісты?
Растлумач, дзяжурны, ты.

Нешта я не разбяруся:
Палачкі, кручкі, калябкі...
— Пётр Пятровіч, гэта ж гусі
Малявалі свае лапкі!

— Дзе сціралка?
— Ўкрала галка.

— Бачыш, пылам клас пакрыты?
А чаму ты сам няўмыты?
Непарадак, Піятух!

А Яўтух той — хітры зух:
— Пётр Пятровіч, скажу вам,
Дык я ж — сан і ўсюды сам:

Я ж і тут, я ж і там,
Хоць вазьмі ты разарвіся...

— А які ж у цябе сан?
— Старшыня ж я
Сан-
Камісіі.

От якая ППШ,
Лепш маўчыце, дзеці, ша.
Нізашто больш не вазьмуся
Я туды вадзіць экскурсіі.

Даў зарок
І падпісаўся:
Ваш дружок —
Вясёлкін Вася.

## АЗБУКА ВАСІ ВЯСЁЛКІНА

Рашыў Вясёлкін Вася:
— Сам адкрываю школу.
Збіраю ў першым класе
І птушак, і жывёлу,
Усіх звяроў на свеце.

І вы прыходзьце, дзеці.
Ў мяне такая кніжка ёсць,
Што рады будзе кожны госць.
Я літары вам пакажу,
Пра ўсе малюнкі раскажу.

Глядзіць Васіль наўкола:
Хто ж першы прыйдзе ў школу?
А тут з двара:
— Здароў, Вясёл!
— А ты хто будзеш?
— Я асёл.

Стаіць і дзівіцца Васіль:
— Нашто аслу аўтамабіль?
Куды вязеш ты агуркі?

— А гэта звычай мой такі,—
Яму адказвае асёл.—
Саджуся з кнігаю за стол —

У рот адразу ж агурок.
— Нашто?
— Каб ведаць лепш урок.

Давай, вучы мяне, Вясёл,
Саджай хутчэй за парту.
Ты ж ведаеш, сярод жывёл
Я самы, брат, упарты.

— Па-першае, я не Вясёл,—
Сказаў Вясёлкін Вася,—
А па-другое, стаўлю кол
За панібрацтва ў класе.

**А**

Буквар мы пачынаем з А,
І я заўважыць мушу:
Не вельмі цяміць галава,
Хоць і даўгія вушы.
Хапае слоў апроч асла,
Што пачынаюцца на А:
Арол, акварыум, алень,
Аса, акула, авадзень,
Авёс, алмаз, атара,
Алена і Алеся
І нават акуляры,
Што ты на нос павесіў.

Як закрычыць асёл: — Браткі,
Вось для чаго мне агуркі!
Ў мяне іх — цэлая гара.
За розум брацца мне пара.
Як з'ем апошні агурок —
Урок засвою назубок.

**Б**

А гэта, дзеці, што за франт:
Завіты ўвесь, на шыі — бант,
І так ілбом у бубен б'е:
— Прыміце ў клас,
Я знаю: Бэ-э-э!

Прыняць выдатніка, прыняць!
Ён заслужыў адразу 5.

**В**

Хто гэта лісця нанізаў
На вострыя іголкі?
А вожык Васю так сказаў:
— Вітаю вас, Вясёлкін.
— Я рад,— прызнаўся Вася,
Ды чым жа ты заняўся?
— Навошта льеш,— пытаю я,—
З вядра ваду на вераб'я?
— Мы з вераб'ём у пары
Збіралі вам гербарый.
Дружок мой запыліўся,
Хачу, каб ён памыўся.

Сягоння ўсе глядзяць на нас,
Бо мы прыйшлі ж у першы клас.

**Г**

Напэўна, дзеці, вы змаглі б
Сказаць і самі: гэта — грыб.
І прозвішча, як у людзей,
У вучня — Баравік.
І ён у школу ўжо ідзе,
Хоць ростам невялік.

Хай невялік, хай невысок,
А ведае здавён
І той лясок, і верасок,
Дзе нарадзіўся ён.

**Д**

І дзяцел ведае свой дом
На дрэве са старым дуплом.
Калі і непагадзь — ну што ж,
Не страшны дзецям снег і дождж.
Як добра ў дзятла пад крылом,
Калі такі выдатны дом!



Хто знае, Дэ знайсці нам дзе?
Пытайце ў бацькі, ў маці,
Шукайце ў дзятлавым гняздзе —
Падкажа добры дзяцел.

**Е Ё**

А за дзвярыма: тук-тук-тук.
Пытае Вася: — Што за стук?
Зноў дзяцел? Не, зусім не ён —
Прыйшоў у школу паштальён:

— Вам тэлеграма ёсць адна.
Здзівіўся Вася: — Ад каго ж?
— Напэўна, што з рачнога дна,
Бо тут унізе подпіс: Ёрш.

— Ну што ж, якраз да часу.
Чытайце ўсяму класу.
Ш-ша, слухайце, што піша ёрш:
«Жыву за іншых я не горш.
Малым паставіў ёлку.
Выпісваю «Вясёлку».
Ды вось бяда: сыны мае
Не ведаюць ні Ё, ні Е.

Да вас у школу трэба плыць,
Але парайце, як нам быць.
Калі паступім мы туды,
Дык жа загінем без вады...»

Сказаў Вясёлкін: — Точна,
Хай вучацца завочна.

**Ж З**

Тут Вася адчыніў акно:
— А гэта што там за яно —
Ці не пад'ёмны гэта кран?
Зірні на вуліцу, баран.

Зірнуў баран, спужаўся:
— Яно з хвастом, з нагамі,
З вушамі і рагамі,
Пад стол хавайся, Вася,
А я залезу ў шафу!..

Вясёлкін рассмяяўся:
— Ды гэта, брат, жырафа.
Яна паспела ў самы раз.
Прашу, прашу, заходзьце ў клас.
Сядайце, калі ласка, ў нас!
Жырафа рада б сесці,
Ды ў школу ёй не ўлезці.

Заўважыў заяц звера,
Збялеў і — шмыг за дзверы,
Па калідоры — скок-скок-скок.
Ён думаў, што з'явіўся воўк.

На парту ўскочыў з перапуду:
— Вучыцца болей я не буду! —
Хапіў адзін, другі званок:
Хутчэй канчай, Васіль, урок!

Цягнуўся цэлы месяц
У класе перапынак,
Шукалі зайца ў лесе
Ля ўсіх дубоў, асінак.
Уцёк са школы Зай, уцёк.

— Што ж, без яго пачнём урок,—
Сказаў Вясёлкін Вася
І за журнал узяўся,
Бо цвёрдую меў звычку —
Штодня вёў пераклічку.

**І Й**

— Індык! — спытаўся Вася,—
А ты куды сабраўся —

Ў гурток шыцця і кройкі?
Дзеля чаго ў запасе
Ў хвасце ў цябе іголкі?
Чаго ты так надзьмуўся,
Ад вучняў адвярнуўся?

— Хаджу я важна па зямлі,—
Затрос індык бародкаю,—
Бо ведаю, што ёсць два І:
І доўгае, й кароткае.

Усё я ведаю, пытай.
Напрыклад: іней, гай і май,
Ігнат, Іван, Іран...

— А бэ-э-э? —
Не вытрымаў баран.—
Не паважаю я цябе,
Бо ты сказаць не ўмееш: бэ!

Спакойна Васева рука
Лягла на дзённік індыка.

— Ты адказаў мне бойка,—
Сказаў настаўнік Вася,—
Але я стаўлю тройку,
Каб больш не зазнаваўся.



**К**

А качаня і кацяня
Паміж сабою як радня.
Усюды разам, удваіх,
Не разальеш вадою іх.

У клас увойдуць, знімуць шапкі,
Пасядуць і — угору лапкі,
Бо качанятка і каток
Заўсёды ведаюць урок.

Выдатнікам настаўнік рад.
А хто іх выхаваў?
Дзетсад.

**Л**

— А што нам скажа Ліска?
— Нічога не скажу.
Не падыходзьце блізка:
Вы ж бачыце, сяджу
Ўвесь дзень перад люстэркам,
Занятая прымеркай.
Напэўна, што завузка
Нейлонавая блузка,
А модная спадніца
Так цісне ў паясніцы...

— Ліса і лісяняткі,
Пакіньце вы заняткі!
У вас, у модніц,— свой прыцэл.
Мы вывучым і самі Л.

**М**

Зірнуў Васіль у кніжку:
— А дзе маленькі Мішка?

— А вунь на школьным ён двары,
Сам у акно пабач.
Прыйшоў да нас мядзведзь стары,
Купіў унуку мяч.

Старому сумна ў лесе
На персанальнай пенсіі.
Сюды штодня хадзіць ён рад,
Насіць малому мармелад.

Такі ж ужо чуллівы дзед,
Вунь прывалок веласіпед:
«Бяры веласіпедзік,
Катайся, мой мядзведзік!»

Сказаў настаўнік: — Ой, дзяды,
Нямала мне ад вас бяды,
Так песціце вы ўнукаў —
Зрываеце навуку.

**Н**

Навуку любіць насарог,
Калі здалёк прыехаць мог,
Аж з Афрыкі, з Нігерыі.
Але ступіў ён на парог —
Не можа ўлезці ў дзверы.

Жырафа рада земляку:
— Жаданы мой, чаканы...
— А ты, жырафачка, адкуль?
— Твая суседка — з Ганы.

— Канікулы,— сказаў Васіль,—
Браткі, не пашкадуем сіл.
Пашырыць трэба школу,
Пляцоўку для футболу,
А для гасцей замежных
Паставіць клас сумежны.

— Ура! — абрадваўся баран,—
Я зараз намалюю план.
І пачалася праца,
Рад кожны быў старацца.



Стаў за учотчыка індык,
Сам працаваць ён не прывык.
Пляцоўку расчышчаў асёл,
Бо вельмі ж ён любіў футбол.
— Ёсць разгарнуцца дзе цяпер! —
Сказаў мядзведзь-пенсіянер.
Стаў пілаваць бярвенні.
Ён пільшчык быў адменны.
Уважліва сачыў унук,
Каб не парваць пілы аб сук.
Знайшлі і вучні-малышы
Сабе занятак па душы.
Тут завіхаліся штодня
І качаня, і кацяня.
І нават зай-зайчына
Вярнуўся, малайчына,
І стаў на дапамогу
Самому насарогу.

Пыхцеў,
Стараўся
Насарог,
Ажно пацеў
І нос,
І рог.
Жырафа следам бегла
І падавала цэглу.
Спраўна брала з долу
Яна любыя высі...

Пабудавалі школу —
Спыніся і дзівіся,
Якія гмахі ўзніклі.
Вось гэта дык канікулы!

**Э**

І зноў увесь сабраўся клас.
Зірнуў у кнігу Вася:
— На чым спыніліся той раз? —
Ён у крата спытаўся.

Разявіў крот шырока рот
І прастаяў бы, можа, год.

Была ў гасцях у школе
З дзетсада ляля Оля.
Сама не знаючы таго,
Яна і адказала: О!



Адкрыла лялечка раток —
Маленькі, роўненькі кружок.
І насарог адкрыў свайго —
Жахнуўся клас увесь: — Ого!

**П**

— Навошта пеўню парасон,
Чаго стаіць на плоце ён
Якраз ля нашых жа акон?

— Схаваўся, дзеці, я ў цянёк,
Каб добра вывучыць урок.
— Скажы нам літару сваю!
— Не, дзеці, лепей я спяю.
Хоць з граматаю не ў ладах,
Але спяваю па складах.
Ніхто так на маім вяку
Яшчэ не пеў: Ку-ка-рэ-ку!

— Ты ўмеў бы значна болей,
Калі б вучыўся ў школе.
Прыходзьце, пеўні, ўсе вы
Да нас у клас на спевы.



— Паслухайце, здаецца,
Хтось ля дзвярэй шкрабецца.
Чакайце, сам праверу.
Зірнуў Васіль на дзверы:
— Дык гэта ж рак.
Адкуль, бядак?
Чаго такі распараны,
Як кіпенем абвараны?

Падняўшы стрэльбу ў клюшні,
Рак адказаў: — Мне душна.

— Нашто ты стрэльбу ў клас валок?
Яшчэ націснеш на курок.
— Так,— адказаў ён горда,— так,
Я — лепшы паляўнічы...
Нічога дзіўнага, што рак
У школу не залічан.

Калі не верыш, дык правер,
Пакуль у рэчцы мелка.

## С

— А хто ў нас на чарзе цяпер?
Сказалі дзеці: — Стрэлка!
— А дзе яна ў нас, дзеці?

— У космасе, ў ракеце!
Абкружыць Сонца сорак раз
І прыляціць ізноў у клас.

## Т

— Я добра бачу па ўсіх вас,
Ваш пазнаю характар —
Нам тэхнікай заняцца час,
Прыйшоў якраз і трактар.

А гэта вось механік сам,
Славуты на ўсім свеце,
Пакажа ўсе машыны вам,
Пракаціць на ракеце.

Наўрад ці ёсць яму раўня —
Паважны і вусаты...
Падняла лапку кацяня:
— Дык гэта мой жа тата!

Механік тут сынка абняў:
— Як вучышся, дзіцятка?
І адказаў сыночак: — М-мяў,
А я — выдатнік, татка...

І загадала татку
Кацяня загадку:

**У**

— У галаве У доўгае,
Кароткае ў хвасце.
Выкручваецца, поўзае
На тоўстым жываце.
Уміг жывога зайца
Глыне — і не падавіцца.
Ну, што? Не адгадаў?
Я падкажу — удаў.



Такая ўродзіна удаў,
Убачыш — зойме дух.
Каб ты, пачварына, прапаў,
Так напалохаў — ух!

Яго не пусцім мы ў свой клас,
Бо праглыне ўсіх нас зараз,

І стол, і школьны глобус,
І новы наш аўтобус.
На чым жа мы, татуся,
Паедзем на экскурсію?

І вось ужо завёў матор
Механік дзядзя Коця.
Ён вельмі строгі быў шафёр,
Суровы на рабоце.

Іда сябе ў кабіну
Не ўзяў ён нават сына:
— Мне на машыне не радня
Ні сват, ні брат, ні кацяня.

**Ф**

Сказаў Вясёлкін Вася:
— Хвалю за дысцыпліну.
Мой клас увесь сабраўся.
Гані, шафёр, машыну...

Ляціць аўтобус па шашы.
Глядзяць з акенца малышы.
Мігцяць фіранкі, як флажкі,
І шоўкавыя фартушкі,
І новыя фуражкі.
Лагодна і пакорна,
Адзетыя па форме,
Сядзяць індык з барашкам.
А за машынай пеша
Услед жырафа чэша,
А за жырафай — ох-ох-ох —
Цялёпкаецца насарог,
Ажно дрыжыць пад імі дол.

— А вы куды?
— Мы на футбол.
— А хіба ў нас сягоння матч? —
Спытаў шафёр з кабіны.

— А вы — балельшчык, Кот-Вусач?
Дык самі знаць павінны,
Што ў нас на стадыёне
Выдатны дзень сягоння:
Аслам забілі гол зайцы.
Вось малайцы дык малайцы!

Як усхапіўся тут асёл:
— Шафёр, вязі нас на футбол!
Хутчэй, хутчэй на стадыён!
Зароў ад горкай крыўды ён.

Ды што паробіш: плач не плач —
Ганебна скончыўся той матч.
Асёл як апантаны
Не мог утаймавацца...

— На плошчу да фантана
Фата-графа-вацца,
Увесь мой клас, збірайся! —
Паклікаў вучняў Вася...
Фацэтны выйшаў здымак —
Цудоўны напамінак
Настаўніку і вучням
Аб дружбе неразлучнай.

**Х**

Хаця хітрун хамелеон
Не сапсаваў ледзь увесь фон.
То з галавы да самых пят
У хатні хутаўся халат,
То захінаўся ў хусту,
Халву з капустай хрумстаў,
Высоўваў доўгі свой язык,
Лізаў жырафе чаравік,
І, хвалячы свой спрыт і рух,
Хапаў па-заліхвацку мух.

І гэтак надзімаўся,
І ў колерах мяняўся,

Што ўсе не клаліся траха
Ад смеху ўпокат: ха-ха-ха!

Аб Васілёвай школе
Прачула ўсё наўколле.
Да нашае экскурсіі
Прыбіліся тры гусі,
Два худыя харты —
Валацужныя браты,
Варона-пабіраха,
Шакал і чарапаха.

**Ц**

Прыцялёпкала здаля
Адно пацешнае цяля:
— А я ў цырку пабывала,
Я прынесла вам цымбалы.
Залічыце ў клас мяне,
Я ўсё на свеце знаю: м-м-ме!
Васіль сказаў: — Пабачым.
Задам табе задачу:



На градзе яна расце,
Пачынаецца на Цэ.
Аж падскочыла цялятка:
— Знаю, знаю — шакаладка!

Засмяяўся Вася:
— Падумай, не спяшайся.
Я лічу да трох: раз, два...
— Ах, я ўспомніла — халва!

— Памыляешся, красуля,—
На градзе расце цыбуля.
І хоць яна не шакаладка,
А есці трэба, для парадку,
Бо ўсе мы знаем як адзін,
Што Цэ — найлепшы вітамін.

**Ч**

Вось чарапашычын сынок
Есць і цыбулю, і часнок.
Няхай яшчэ сыночак
На выгляд — чарапочак,
Затое ў нас у школе ён
Ужо вядомы чэмпіён.

Малы чарапашонак
Не носіць распашонак.
Выходзячы на шпацыр,
Ён надзявае панцыр,
Таму не гнецца пад мячом,
Не хіліцца пад молатам.
Расце выдатным сілачом
І незвычайным волатам.

**Ш**

Мы не змаглі б вучыцца
Ні з воўкам, ні з ваўчыцай.
А вось прыйшоў да нас шакал
І ледзь усіх не ашукаў.

Ён доўга носам шморгаў
І Васіля ўгаворваў,
Нібы прасіўся ў школу,
А сам пры шаблі, ў шпорах,
Прынёс дзве торбы толу,
Шнур, дынаміт і порах.

Не, ашуканец шэры,
Табе не будзе веры.
Ты з выгляду — лагоднік,
А сам — шпіён і шкоднік.

**Ы**

Ёсць літары у буквары,
З іх не пачнеш ты слова.
Але запомніце, сябры,
Вы іх абавязкова.
Ну, хто мне іх напіша?

— Мы,— адказалі мышы.—
Каб не было на свеце Ы,—
Запелі хорам мышкі,—
Былі б мядзведзямі ўсе мы,
Нас дзеці б звалі — мішкі.

Была дзяўчынка ў нас адна,
Рукамі пляснула яна,
Прызналася ўсім шчыра:
— Як добра, што я — Іра!

**Ь**

Каню прысніўся страшны сон,
Што ён не конь, а кон.
Перапалохаўся бядак:
— Куды падзеўся мяккі знак?
Мне без яго жыцця няма...

Прыбег задоўга да відна
Да нас буланы госць:

— Ці мяккі знак яшчэ ў вас ёсць?
Яму сказаў Вясёлкін так:
— Вось, калі ласка, мяккі знак.

Яго сабе ты забірай,
Бяжы і весела гуляй.
І так быў рады, небарак,
Што зноў знайшоў свой мяккі знак.

— Эх,— схапіўся Вася,—
Экскурсія ўдалася,
Ды час дамоў збірацца,
Зноў за навуку брацца.

**Э**

Я заказаў вам эшалон.
Сядайце кожны ў свой вагон.

Купэ — для насарога,
Жырафу — на платформу.
Адзеньцеся ў дарогу
У школьную ўсе форму...

Гудуць па рэйках колы.
Дадому едзе школа.
Ад песень і ад смеху
Чувáць далёка рэха.
Мільгнуўся элеватар,
А вунь — электрастанцыя,
Торф рэжа экскаватар
На рэчцы Балачанцы.
Між родных сосен і бяроз
Імчыцца наш электравоз.

**Ю**

Вучыцца зноў прыйшла пара.
— Ура! — гучыць сярод двара.

На выстаўку юннаты
Выносяць экспанаты:
Капусту,
рэпу,
буракі,
Фасолю,
моркву,
агуркі.
Зірніце на цыбулю!
Яе расціла Юля!

Умела пастарацца
Яна на школьнай градцы.
Цяпер усе мы як адзін
Цыбулю Юліну ядзім.

**Я**

А вось малая Ядзя
Сабрала ў нашым садзе
Пад яблыняю ягады —
Не паядзім за два гады.

Так вучыцца, стараецца
Дружная сям'я.
На гэтым і канчаецца
Азбука мая.

# Добры знак





## ВАРТАВЫ ЧАСУ

Ён — лепшы наш прыхільнік,
Спаць позна не дае.
Вы скажаце — будзільнік,
Э, не, сябры мае.

Вы скажаце, напэўна,—
Найлепш вартуе час
Гарласты бабін певень,
Што нас будзіў не раз.

Прычыну знойдзе кожны,
Хто сам паспаць ахвоч.
Вартаўніку няможна,
І ён не зводзіць воч.

Ноч цемраю агорне
Навокала зямлю —
Упарты, непакорны,
Ён кажа: — Я не сплю!

Праб'е шчыліну ў небе,
Уважліва глядзіць —
Каму на працу трэба,
Каго пара будзіць.

І ночы шкарлупіну
Крамсае на шматкі,
Не знаючы спачыну
Бяссонныя вякі.

Світаннем пачынае
Ён свой працоўны дзень,
Ён першы нас вітае,
Сонечны прамень.

## ВЯСНА

Паміж снегу ў лесе — дзіва.
Хто ні гляне, скажа: ах!
Я агеньчык зіхатлівы
Радасна нясу ў руках.

Горнуцца дубы, бярозы
Голлем да майго цяпла.
Больш не вернуцца марозы —
Я пралеску прынясла.

## СОНЕЙКУ

Соня,
Соня,
Сонейка!
Зашумела голлейка.
Пачынаецца
Вясна,
Прачынаецца
Сасна.

Точыць
Дзяцел
Долата,
Сыпле
Долу
Золата.

Соня, сонейка, ўставай,
Дзень шчаслівы пачынай,
І мне весела свяці
Ты заўсёды
У жыцці.

## ДВА БРАТЫ І СОНЦА

Скрозь мукой пазасыпаны
Ўсе яры, лагчыны.
Бор стары прачнуўся рана,
Лыпае вачыма.

Лысай галавой панік,
Уздыхае горна:
— Што так доўга сакавік
Круціць свае жорны?

Ельнік
Белы,
Белы,
Белы.
Мельнік
Меле,
Меле,
Меле.

Выйшаў з лесу красавік:
— Хопіць, браце-чараўнік.

Лепш зірні на мой пірог,
Кагадзе што з печы.
Ты падняць бы мне памог,
Падстаўляй, брат, плечы.

Сталі падымаць удвох.
Ох, і цяжкі пірог.
Ледзь узвалаклі на дуба,
Паглядзелі — сэрцу люба,

Палажылі на сасонцы,
Глянулі, аж гэта — сонца!

## ДОБРЫ ЗНАК

І шафёр, і пешаход —
Кожны знае ў свеце
Знак увагі: «Пераход!
Асцярожна: дзеці!»

Грузавік спыніў свой ход,
Сталі легкавушкі,
Асцярожна: пералёт!
Асцярожна: птушкі!

Кожны падарожны рад
Прывітаць, прывеціць:
— Добрай раніцы, дзетсад!
Добры шлях вам, дзеці!

Нават сонца маладзей
Глянула з блакіту.
Гэта будучыні дзень
Выйшаў на арбіту.

Хай заўсёды з веку ў век
Добрым знакам будзе:
Асцярожна — чалавек!
Асцярожна — людзі!

## ДОЖДЖЫК

Быў жа ён зусім малы,
А як стаў на ножкі,
Абабег усе вуглы,
Абскакаў дарожкі.

Што гарэзніку гара,
Дрэвы, агароджа!
Выбег з нашага двара
І ўстаяць не можа.

Дыб, дыб, дыб — і на сцяну,
Шлях далейшы сочыць.
У завулак сігануў,
На трамвай ускочыў.

На прыпынку святлафор
Лыпнуў грозным вокам,
Ён — з падножкі і папёр
Вуліцай шырокай.

Не зважае на агні,
Смаліць на чырвоны.
Калі хочаш — дагані,
Дзе там — не дагоніш!

Толькі пырскі ад вады,
Мільгаценне ножак...
Ой, наробіш ты бяды,
Непаслушны дожджык!

## ВЯСЁЛКА НА ВАДАПОІ

Зірніце, вунь дзіва якое —
вясёлка на вадапоі!

Адразу ж пасля навальніцы
прыпала дадолу ніцам
па абодва бакі —
адным да крыніцы,
другім да ракі.

Мусіць, добра сасмагла-такі
і знясілела, знемагла.
Вельмі ж доўга піла
і піла.

Напілася, устала,
зноў да самага неба дастала
і ў сем столак,
у сем новых вясёлак
ярка-ярка
над намі зайграла.

## МАЙСКАЯ ГОСЦЯ

Прыляцела, прыляцела
Першаю паштоўкаю.
Пад акном на дроце села,
Радасна зашчоўкала:

— Я ляцела гарадамі,
Вёскамі і сёламі,
Над палямі, над садамі
За вясной вясёлаю.

Несці навіну на крылах
Памагалі гусанькі.
Я сама сабе пашыла
Хвартушок бялюсенькі.

Выгладжу сваю абнову,
Вычышчу ўсе пёрачкі,
Каб у дзённіку вясновым
Мецьадны пяцёрачкі.

Калі ў вас іх малавата
Ці даўно ўжо меліся,
Не хачу быць вінаватай —
Давайце падзелімся.

Кожны, хто мяне пазнае,
Няхай павітаецца:
— З добрым маем,
З цёплым маем,
З сонечнаю раніцай!

— А мы ўсе цябе пазналі,
Просім, калі ласачка,
Сябраваць заўсёды з намі,
Ластавачка, ластаўка!

## ДЗЕ ХАВАЕЦЦА ВАЙНА

— Дзе хаваецца вайна? —
Запытаўся ўнук у дзеда.
— Хто яго, унучак, зна...—
Адным словам, дзед не ведаў.

А хаваецца вайна
Недалёка ад людзей.
Хлопчык ведаў, дзе яна,
І павёў дзеда ў музей.

Цэлы дзень яго вадзіў,
Паказаў усё падрад.
Колькі там усякіх дзіў:
Мін, снарадаў і гармат!

Ёсць зямлянка, дот і дзот,
Танк з чырвонаю звяздой,
А на дрэве — кулямёт,
Як буслінае гняздо.

Клекаталі там «буслы»,
Што зямля гула вакол...
Паказаў унук малы
Дзеду «мінскі кацёл».

Хочаш — вер ты ці не вер,
А кіпела ў тым катле
Так, што страшна і цяпер.
— Ты баішся, дзед?
— Але.

І здзівіўся ўнук: — А ты ж
Быў адважны партызан...
— Слухай, мілы мой малыш,—
Уздыхнуў дзед і сказаў:

— Болей страшнай, чым вайна,
У жыцці няма бяды,
Застанецца хай яна
У музеі назаўжды.

## ЛОСЬ У ГАРОСЕ

Ой, улавілі лося ў гаросе,
а па ім ласіха ў лесе галосе:
— Што ж гэта будзе,
добрыя людзі?

Вы паўшчувайце,
строгае слова скажыце,
ды мне, беднай, паспачувайце,
не карайце задужа,

не вяжыце,
ой, не вяжыце
вяроўкамі
майго любага мужа.

Рваць гарох пры дарозе —
спрадвек не злачынны занятак.
Не для сябе ён стараўся —
для ласянятак,
для любімай пястункі,
малога дзіцятка,
што чакала ласунку —
гарошку ў лапатках.

Дык завошта аблава
і такая няслава?
Вунь стаіць ля дарогі
ўвесь аблытаны —
ногі і рогі,
як цянётамі сеткі.

Заступіцеся, дзеткі!
Ён не выцерпіць гэтакай мукі.
Ой, вазьміце ляся на парукі!

## НУЛЕВІКІ

Мы з ім — даўнія знаёмцы
І сябруем з першых дзён,
А сустрэліся ў нулёўцы,
Як прыйшоў у школу ён.

— Як нам зваць цябе? — спытаўся
Сябрука малога я.
І, адзіны ва ўсім класе,
Ён не знаў свайго імя.

Пачалі пытаць таксама
Дзеці ўсе, увесь наш клас:

— Як жа кліча цябе мама:
Пецяа, Павел, Апанас?

— Не,— сказаў нам незнаёмы,—
У мяне імёнаў шмат.
Называюся я дома:
Сын, унук, пляменнік, брат.

Ну, а клічуць, хто як хоча:
Баба — коцік, дзед — каточак.
Тата кажа: — Любата
Ў хаце мець свайго ката.
Вельмі ж любяць яго мышы,
Ім каток дзяцей калыша...

— Мяў!— сястра мяне гукае,
Што зусім яшчэ малая,—
І мяне пакалышы,
Хвосцікам паварушы!

Калі ладжу я з сястрою,
Мама ў радасным настроі
І заўсёды дадае:
— Ах вы, лапачкі мае!..

Прыязджае ў госці цёця,
Называе мяне: коця.
Паспрабуй не адгукніся:
— Дзе ты, коця, дзе ты, кіса?

Ну, і людзі, ну, народ,
Проста не хапае сіл.
Хіба ж я і праўда — кот?
Я шэсць год ужо Васіль!

Строгі ў нас дырэктар школы,
Але добры і вясёлы.
Ён сказаў: — Наталля Іванаўна,
Пачынайце
Усё нанава.

Пачынайце ўсё з нуля,
Буду памагаць вам я.
Бачу, вартыя ў вас хлопцы
І дзяўчаткі — у нулёўцы.

Падабраўся ў самы раз
Лепшы клас якраз для вас,
Той, які хацелі вы.
Для ўсёй школы ён апорны,
Паказальны і узорны,
Бо вядома ж — нулявы!

Мы Іванаўну Наталлю
Палюбілі з таго дня,
Мы з настаўніцаю сталі,
Як найлепшая радня.

— Добры дзень! Надзеньце тапкі,
Сядзьце ўсе і хорам гучна
Адкажыце, хто вы, лапкі?
— Нат Іванаўна, мы — вучні!

З вамі пачалі здаля,
З вамі пачалі з нуля,
А што школе невядома —
Кожны наганяе дома.

Як вучыцца на выдатна —
Ведаюць і дзед, і бабка.
Вучань, да навукі здатны,
Ён — не кіска і не лапка.

Не рашаецца задача —
Ён не хныча і не плача.
Няхай тата з мамай самі,
Самі хліпаюць насамі.

Хай паплачуць і паскачуць —
Памагаць жа трэба сыну.

Справяцца з малой задачай —
Я ім большую падкіну.

Бо дырэктар нашай школы,
Хоць і строгі, а вясёлы,
Кажа, ёсць закон такі
І на тым стаіць зямля,
Што мы ўсе — нулевікі,
Пачыналі ўсе з нуля!

## ДОКТАР НОС

Чаго ходзяць у бальніцы?
Кожны ведае — лячыцца.
Там ёсць многа дактароў,
І так лечаць — будзь здароў!

Захварэў і я, пайшоў.
Доктар кажа: — Здайце кроў.
— Ой, не дам, не дам крыві!
Доктар кажа: — Не раві!

Калі можаш — пацярпі:
Усю ноч не еш, не пі
І прыходзь да нас галодны,
Калі ў школе ты свабодны.

Я яшчэ мацней зароў:
— Для чаго мая вам кроў?
Я прыйшоў прасіць даведкі...
Доктар кажа: — Ну і дзеткі!

Што баліць?
— Усё баліць,—
Зноў расказваю ўрачу я.
— У вушах звініць?
— Звініць.
Ў школу не магу хадзіць,
Я настаўнікаў не чую.

Доктар за руку мяне,
Цераз калідор наўскос
Паказаў на кабінет:
«Вуха, Горла, Нос».

Дактароў нам трэба слухаць,
Калі ўжо бяда прыпёрла.
Вуха... няхай будзе вуха,
А пры чым, скажыце, горла?

Я — сапраўдны эскімос,
Эскімо грызу ў мароз,
Мог бы з'есці цэлы воз.
А пры чым, скажыце, нос?

Вуха... Вуха хай праверацъ.
Я пастукаў ціха ў дзверы.
Думаў я, што там іх трое,
Аж адзін перада мною
Дзядзя з люстрам на ілбе:
— Што, мой дружа, у цябе?
Тут зусім ажыў я духам:
— Вы па вуху?
— Я па вуху.
— А дзе Горла, а дзе Нос?

— Ах, каб ты здаровы рос!
Я дамоў адправіў іх —
Сам працую за траіх.
Я падумаў: вось ён дзе,
Хто паможа мне ў бядзе!
Доктар казырок люстраны
Апусціў ніжэй на лоб:
— Ну, таварыш паважаны...

— Стоп! — крычу я.— Стойце, стоп!
Вы мне вушы правярайце,
Не чапайце вы мой нос,
Лепш хутчэй даведку дайце,
Каб я класнаму занёс.

— Ах, даведку,— сказаў Нос,—
Так бы з самага пачатку.
У мяне іх — цэлы стос.
Бачыш, з подпісам, з пячаткай.

Напішу табе па форме,
Так, як мае быць:
«Горла ў норме, вушы ў норме,
Нос — укараціць».

Досыць галаву марочыць,
Дарагі мой друг.
— А хто будзе... укарочваць?
— А я сам — хірург.

Бачу, кончыліся штукі,
Бачу, доктар мые рукі —
Даў я з кабінета чосу,
Рады, што застаўся з носам!

Чаго ходзяць у бальніцы?
Кожны ведае — лячыцца.
Там ёсць многа дактароў,
І так лечаць — будзь здароў!

## АГЛЕДЗІНЫ ВОСЕНІ

Выйшаў наш дзіцячы сад
Восені рабіць агляд.

Пажаўцелі ўжо кусты,
З дрэваў падаюць лісты.

— Асцярожна! — сказаў Вова,
І падняў ён ліст ліповы.

— Гляньце, гляньце,
Гэта ж — сэрца.
Набяру лістоў вядзерца,

Панясу я іх дадому
Брацiку свайму малому.

Сам букет яму зраблю,
Вельмі ж я яго люблю.

Дзве сястрычкі, Маша з Юляй,
Назбіралі для бабулі

І сабе на імяніны
Кошык буйнае рабіны.

— Што ў нас будуць за каралі! —
Ўсе сяброўкі прымяралі.

А што ў нашага Івана?
У Івана — ліст каштана.

Як магутная рука —
Кулаком заб'еш цвіка.

Каб такія ў нас былі,
Мы пайшлі б у кавалі.

— Ой,— узрадавалася Волька,—
Я знайшла сабе іголку,

Новую, сасновую,
Іголку адмысловую.

І цяпер я разам з маці
Буду шыць сястрыцам плацці.

Паглядзіце вы, што ў Лёвы!
Чысты, светлы ліст кляновы —

Трапяткі, высокі парус,
Падхапіў ён хлопца мару

І панёс, панёс па хвалях,
Па нявыведаных далях...

А што ў Мішы, Пеці, Колі?
Кожны выбраў ліст таполі —

Лёгкі, зручны, нібы кельма.
Нашы хлопцы рады вельмі.

Ім самім цагліны класці
У падмурак свайго шчасця.

## СЯБРОЎКІ

Хто там грукае ў акно?
Гэта вы, сінічкі?
Я прачнулася даўно,
Запляла касічкі.

Вось надзену кажушок,
Выбегу на ганак,
З лесвіцы змяту сняжок,
Вынесу сняданак.

Тут халва і тваражок,
Скрылічак каўбаскі,
Цёплы з мясам піражок —
Ешце, калі ласка.

У абед, сінічкі, зноў
Прылятайце смела.
Ну, а мне — пара дамоў,
Я ж сама не ела.

## ЛІСТАПАД

Як малое птушанятка,
Перабег лісток дарожку.
Кінуўся за жоўтым статкам,
Мільганулі толькі ножкі.

Закружылі па асфальце
За чародкаю чародка.
Любыя, не адлятайце —
Будзе вырай ваш кароткі.

Зменіцца зіма вясною,
Узляціце зноў на дрэвы.
Зноў шчасліваю парою
Я пачую вашы спевы.



## РАЗВІТАННЕ З «БУКВАРОМ»

З табой прыйшлі мы ў першы клас
Асеннім цёплым ранкам,
А сёння ўжо нам брацца час
За новую чытанку.

Ляцяць, ляцяць сняжынкі з хмар
І над зямлёю кружаць.
Табе мы дзякуем, «Буквар»,
Бывай, наш добры дружа!

Да нас прыйшла твая сястра
У клас сяброўкай новай.
Прыйшла шчаслівая пара
Дружыць нам з «Родным словам».



## БЕЛЫ БЫЧОК

Харошых свят багата,
Я ўсе святкую іх.
Ды не люблю я свята
Дзеля чытання кніг.

Нагрузкі мнагавата,
Ажно на семярых.
Ну што гэта за свята —
Сем дзён без выхадных?

Цяжкія абавязкі,
Каб гладка, без сучка

Сем дзён чытаць вам казку
Пра белага бычка.

Сябры ад ранку клікалі
На лыжы, на канькі.
Плакалі канікулы,
Вясёлыя дзянькі.

Пракляты бык! Няхай бы
Мядзведзь цябе задзёр,
Ганяюць хлопцы шайбу,
Ажно раве наш двор.

Чацвёрты дзень чытаю,
Амаль не ем, не п'ю.
Начэй недасыпаю,
Трымаюся, цярплю.

Я пяты дзень пацею,
Над кнігаю сяджу,
Я шосты дзень па тэле
Хакея не гляджу.

Цяпер адна ўжо мама
Няспынна сёмы дзень

Хварэе за «Дынама»,
Лік за мяне вядзе.

Вы ўсе зрабілі ўрокі?
А я... але — маўчок.
Вось да якой марокі
Давёў мяне бычок.

Адстаў я па футболу —
Ў свае вароты б'ю.
Хутчэй, хутчэй у школу,
На ўроках хоць пасплю!

## ПРА ВЯРОВАЧКУ

Тоненькая Томачка,
Лёгкая, як пёрачка.
Запрашаю Томачку
Скакаць цераз вяровачку.

Запрашаю Томачку
Я ў школу на ёлачку:
Зіхаціць, як зорачка,
Святочная Томачка.

Запрашаю Томачку
На трасуху-полечку.
Скача, скача Томачка,
Томачка-няўтомачка.

Не магу ніколечкі
Я цяпер без Томачкі —
Мілай перапёлачкі
І руплівай пчолачкі.

Калі побач Томачка,
Я не знаю горачка.
Звязаныя з Томачкай
Мы адной вяровачкай.

ЗМЕСТ

## КАЗКІ ДЗЕДА ВАСІЛЯ

**Ладачкі-ладкі**

Ай і ой . . . . . . . . . . 8
Бабіны госці . . . . . . . 8
Дарожка . . . . . . . . . . 9
Мама мыла раму . . . . . 10
За дзве місы . . . . . . . 10
Коця і Каця . . . . . . . . 10
Млын . . . . . . . . . . . 11
Сарочыны блінцы . . . . . 12
Калыханка . . . . . . . . . 13
Іванка . . . . . . . . . . 14

**Пацешкі**

Мастак . . . . . . . . . . 16
Барабанка. . . . . . . . . 16
Пажар . . . . . . . . . . . 17
Бабры . . . . . . . . . . . 17
Піла . . . . . . . . . . . 18
Тачыльшчык . . . . . . . . 18
Падабед . . . . . . . . . . 19
Гасцінцы . . . . . . . . . 19
Ад самага ранку . . . . . 20
Цяляткам . . . . . . . . . 20
От я даў . . . . . . . . . 20
Бычок . . . . . . . . . . . 21
Забіякі . . . . . . . . . . 21
Дожджык з сонцам . . . . 22
Песта . . . . . . . . . . . 22
Прастакваша . . . . . . . 22
Чутка . . . . . . . . . . . 23
Блёкат . . . . . . . . . . 23
Благата . . . . . . . . . . 23
Пан . . . . . . . . . . . . 23
Музыкі . . . . . . . . . . 24
Тук . . . . . . . . . . . . 24
Абыяк . . . . . . . . . . . 25
Пажаданне . . . . . . . . . 25
Тыдзень . . . . . . . . . . 25
Месяцы . . . . . . . . . . 26
У абутковым магазіне . . 26
Пальцы . . . . . . . . . . 27
Партрэт . . . . . . . . . . 28

**Скорагаворкі**

Рак . . . . . . . . . . . . 30
Крот . . . . . . . . . . . 30
Шпачок . . . . . . . . . . 31
Пасярод двара . . . . . . 31
Скача грак . . . . . . . . 31
Кобра . . . . . . . . . . . 32
Добры госць . . . . . . . . 32
Ці лілі . . . . . . . . . . 32
Дежань, седзень . . . . . 33
Воўк . . . . . . . . . . . 33
Сорак сарок . . . . . . . . 33
Тарарам . . . . . . . . . . 34
Дудар дудару . . . . . . . 34
Капялюш . . . . . . . . . . 35
Капыльская горка . . . . 35

**Лічылкі**

Раз, два, тры, чатыры... 38
Булава . . . . . . . . . . 38
Малыя аленікі . . . . . . 39
Палачка-стукалачка . . 39
Попел, попел... . . . . . . 40
Валакуча . . . . . . . . . . 40
Нуль . . . . . . . . . . . . 41
Нуль Буль-Буль . . . . . 41

**Гульні**

Праводзіны снежнай бабы . . . . . . . . . . . . 46
Класы . . . . . . . . . . . 48
Леў . . . . . . . . . . . . . 48
Ірыс і барбарыс . . . . . 49
Кажух . . . . . . . . . . . 50
Куды едзеш, хлапчына? 51
Казёл . . . . . . . . . . . 52
Козачка . . . . . . . . . . 54
Са́ва і сава́ . . . . . . . . 54
Васілёў кісель . . . . . . 55
Ліса і лісічкі . . . . . . . 55
Карусель . . . . . . . . . 56
Знаходка . . . . . . . . . 56
Мышка . . . . . . . . . . 58

**Казкі**

Дударык . . . . . . . . . . 60
Генерал Верабей . . . . 62
Казка без канца . . . . . 63
Кашчэевы харчы . . . . 64
Ёжка . . . . . . . . . . . . 66
Хто памагае сонцу . . . 69
Лідачка і хмара . . . . . 72
Казка пра зязюлю . . . . 75
Казкі і краскі . . . . . . 76

**Загадкі**

Дзедаў карабец . . . . . 82
Браты . . . . . . . . . . . 83
У дзвюх матак . . . . . . 83
Повен хлявец . . . . . . . 83
Сёстры . . . . . . . . . . . 84
Круглы, як сонца . . . . 84
На палачцы . . . . . . . . 84
Сядзіць Мікіта . . . . . . 85
Траву тру . . . . . . . . . 85
Брат і сястра . . . . . . . 85
Сям'я . . . . . . . . . . . . 86
Конь . . . . . . . . . . . . 86
Маці, дачка, сын . . . . . 87
Не пытайся ў мамы . . . 87
Пад адным брылём . . . . 88
Бабуля . . . . . . . . . . . 88
У яры хаваюся . . . . . . 88
Сяку, сяку . . . . . . . . . 89
За тры вазы . . . . . . . . 89
З-пад капелюша . . . . . 89
У маленькай хаце . . . . 90
З цёмнай хмары . . . . . 90
Вадавоз . . . . . . . . . . 91
Страшны звер . . . . . . 91
Сем вясёлых маляроў . . 91
Ніверма . . . . . . . . . . 91
Індыкова загадка . . . . 92
Загадка пра зярнятка . . 93

**Задачкі**

Пра панчошкі і рукавічкі . . . . . . . . . 96
У кожным кутку . . . . . 97
У старога вераб'я . . . . 97
Вераб'іная зарплата . . . 98
Колькі пальцаў? . . . . . 98
На вярбіне . . . . . . . . 99
Мая сям'я . . . . . . . . . 99
Разрэжце самі . . . . . . 100
Колькі сарок? . . . . . . 100
Пяты . . . . . . . . . . . . 101
Ляцелі галубы . . . . . . 102
Два самазвалы . . . . . . 102

**Госці**

Прыляцелі госці . . . . . 104
Аляпка . . . . . . . . . . . 105
Крыжадзюб . . . . . . . . 105
Гіль . . . . . . . . . . . . . 106
Амялушка . . . . . . . . . 106
Шчыгол . . . . . . . . . . 107
Дзятлік . . . . . . . . . . . 107
Жаўна . . . . . . . . . . . 108
Пліска . . . . . . . . . . . 108
Бусел . . . . . . . . . . . . 108
Чыж . . . . . . . . . . . . . 109

Слаўка . . . . . . . . . . 109
Перасмешка . . . . . . . . 110
Сыч і сава . . . . . . . . . . 110
Стрыж . . . . . . . . . . 111
Драч . . . . . . . . . . . . 111
Верабей . . . . . . . . . . 112
Чачотка . . . . . . . . . . 112
Перапёлка . . . . . . . . 113
Шпак . . . . . . . . . . . 114
Ястраб . . . . . . . . . . 114
Галка . . . . . . . . . . . 114
Хто гэтак спявае . . . . . 115
Лебедзі . . . . . . . . . . 116
Салавей . . . . . . . . . . 116
Сініца . . . . . . . . . . . 117
Пеначка . . . . . . . . . . 118
Гарыхвостка . . . . . . . 118
Дрозд . . . . . . . . . . . 119
Зязюля . . . . . . . . . . 119
Фазан . . . . . . . . . . . 120

**Птушыная школа**

Званок . . . . . . . . . . 122
Удод . . . . . . . . . . . 122
Сойка . . . . . . . . . . . 123
Цяцёрка . . . . . . . . . . 123
Сарока . . . . . . . . . . 124
Круцігалоўка . . . . . . 124
Сіваваронка . . . . . . . 125
Крапіўнік . . . . . . . . 125
Івалга . . . . . . . . . . . 126
ППШ . . . . . . . . . . . 126

**Азбука Васі Вясёлкіна** 133

**Добры знак**

Вартавы часу . . . . . . 153
Вясна . . . . . . . . . . . 154
Сонейку . . . . . . . . . . 154
Два браты і сонца . . . . 155
Добры знак . . . . . . . . 156
Дожджык . . . . . . . . . 157
Вясёлка на вадапоі . . . 158
Майская госця . . . . . . 158
Дзе хаваецца вайна . . . 159
Лось у гаросе . . . . . . 160
Нулевікі . . . . . . . . . 161
Доктар Нос . . . . . . . . 164
Агледзіны восені . . . . 166
Сяброўкі . . . . . . . . . 168
Лістапад . . . . . . . . . 169
Развітанне з «Буква-
ром». . . . . . . . . . . . 170
Белы бычок . . . . . . . 170
Пра вяровачку . . . . . . 172



Літаратурна-мастацкае выданне

**ВІТКА Васіль (КРЫСЬКО Цімох Васільевіч)**

**ЧЫТАНКА-МАЛЯВАНКА**

**Ладачкі-ладкі, лічылкі, загадкі,
байкі, самагудкі, жарты, перакруткі,
казкі, пацешкі, вясёлыя ўсмешкі.**

*Для дзяцей дашкольнага
і малодшага школьнага ўзросту*

Рэдактар Н. І. Міранчык. Мастак А. В. Александровіч. Мастацкі рэдактар Ю. Ц. Цярэшчанка. Тэхнічны рэдактар С. А. Абрамчук.

Здадзена ў набор 14.05.91. Падпісана да друку 03.03.92. Фармат 60х90 $^{1}/_{16}$. Папера афс. №1. Гарнітура Кудрашэўская энцыклапедычная. Афсетны друк. Ум.-друк. арк. 11,0. Ум. фарб.-адб. 44,50. Ул.-выд. арк. 9,21. Тыраж 4000 экз. Зак. 92.

Дзяржаўнае прадпрыемства «Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ №7, 16.03.1993 г. 220600, Мінск, Машэрава, 11.
Мінская фабрыка каляровага друку. 220024, Мінск, Каржанеўскага, 20.
Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.


«юнацтва»

ВІТКА

# Чытанка – маляванка